Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

9 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
АЎТОРАК
№ 192
(26057)
Кошт 380 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «прамая лінія»

ПЕНСІЙНАЯ «РАСКЛАДКА»

Як і калі праводзіцца пераразлік пенсій, хто мае права на надбаўкі і павышэнні, што чакае пенсіянераў-датэрміноўшчыкаў, якія змяненні могуць адбыцца ў пенсійным заканадаўстве, а таксама асаблівасці вылічэння стажу і заробку — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» «Звязды» з удзелам **начальніка Галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.**

Такім чынам, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» адбудзецца **10 кастрычніка з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.

А. Лукашэнка павіншаваў У. Пуціна з 55-годдзем

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна з 55-годдзем. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі.

«Перакананы, што Ваш багаты вопыт, аўтарытэт, высокія дзелавыя якасці будуць і ў далейшым садзейнічаць развіццю беларуска-расійскіх інтэграцыйных адносінаў, якія адпавядаюць інтарэсам двух народаў», — гаворыцца ў віншаванні.

Падпіска-2008

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8800**	**26400**	**52800**
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8300**	**24900**	**49800**
63858 (ведамасны)	**14000**	**42000**	**84000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**12800**	**38400**	**76800**

ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» «Да запатрабавання» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

63850 (індывідуальны)	**7460**	**22380**	**44760**
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**6990**	**20970**	**41940**
63858 (ведамасны)	**9938**	**29814**	**59628**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**9431**	**28293**	**56586**

«ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ ВЁСКА!»

Фата Анатоля КЛЕШЧУКА

Лагойскі раён.

ДАЖДЖЛІВА І ХОЛАДНА, УНАЧЫ ЗАМАРАЗКІ

На гэтым тыдні чакаецца тыповае восеньскае, але не вельмі камфортнае надвор'е, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

У пачатку тыдня наша краіна апынулася ў тылавой частцы цыклона з цэнтрам над Архангельскай вобласцю. Таму сёння на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы 3—8, удзень 7—12 градусаў. Ужо ў сераду мы трапім у зону павышанага ціску, ападкі спыняцца і пахаладае. Тэмпература паветра ўначы 1—7, на глебе і месцамі ў паветры замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў, на тарфяніках Палесся 4—5 марозу, удзень 6—13 градусаў цяпла.

У чацвер надвор'е яшчэ больш пагоршыцца, бо да нас завітае чарговы атлантычны цыклон, які пройдзе праз Балтыйскае мора. У чацвер на большай частцы тэрыторыі, а ў пятніцу месцамі чакаюцца дажджы, уначы і раніцай магчымы мокры снег. У гэтыя дні месцамі будзе ўзмацненне ветру з парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы ад 1 градуса па поўначы да плюс 7 па поўдні.

Месцамі замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў на глебе і ў паветры. Тэмпература паветра ўдзень 8—13 цяпла.

На выхадныя на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць халоднае арктычнае паветра. Месцамі, галоўным чынам па поўначы, пройдуць невялікія дажджы. Тэмпература паветра ўначы 1—6, месцамі замаразкі да мінус 4 градусаў, удзень — 3—9 цяпла. Такім чынам, сярэднясутачная тэмпература паветра на выхадныя ўсталюецца прыкладна на 1—3 градусы ніжэй за норму.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ — $3151,5 МЛН

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні, паводле папярэдняй інфармацыі, за мінулы месяц павялічыліся на 12,7 працэнта — да 3151,5 млн долараў ЗША, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч.

Найбольшую ўдзельную вагу ў міжнародных рэзервовых актывах у нацыянальным вызначэнні займаюць рэзервовыя актывы ў замежнай валюце — 2329,5 млн долараў. На манетарнае золата прыходзіцца 185,7 млн долараў. За сёлетнія студзень—верасень золатавалютныя рэзервы краіны павялічыліся на 1398,2 млн долараў. Міжнародныя рэзервовыя актывы рэспублікі, якія разлічаны па методыцы МВФ, за дзевяць месяцаў узраслі на 771,9 млн долараў — да 2154,8 млн долараў. Тут найбольшую ўдзельную вагу займаюць актывы ў замежнай валюце (1886,3 млн долараў, або 87,5 працэнта) і манетарнае золата (185,7 млн долараў). Іншыя актывы ў структуры міжнародых рэзерваў Беларусі складаюць 82,8 млн долараў, або 3,9 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

Сёння — Сусветны дзень пошты

СВЯТА, ЯКОЕ СВЯТКУЕ СВЕТ

Бернская канвенцыя 9 кастрычніка 1874 года стала свайго роду днём нараджэння Сусветнага паштовага саюза — міжнароднай арганізацыі, якая аб'ядноўвае паштовыя адміністрацыі 192 краін. У тым ліку, на працягу апошніх 60 гадоў, нашай.

На спецыяльна прымеркаванай да свята прэс-канферэнцыі кіраўнікі РУП «Белпошта» расказалі аб тым, чым жыве пошта Беларусі, над чым працуе, як, так бы мовіць, выглядае сярод іншых... Ну і, зразумела ж, чаго чакаць ад яе і працаўнікам галіны, і кліентам.

Для апошніх даўно не сакрэт, што з дапамогай пошты можна не толькі адправіць ліст ці пасылку ў любы куток свету, падпісацца на патрэбныя выданні, адправіць грашовы перавод... На рахунку прадпрыемства больш за 40 відаў паслуг — і сваіх, традыцыйных, і адносна новых. «Белпошта», паводле слоў начальніка ўпраўлення рэалізацыі і продажаў прадпрыемства А. С. Долбіка, з'яўляецца адным з буйнейшых дылераў усіх аператараў мабільнай сувязі: аказаннем гэтых паслуг на тэрыторыі краіны займаецца каля 450 пунктаў. У тым ліку амаль палова — у аграгарадках.

Апроч таго...

— Нашы кліенты звыкліся з тым, што на пошце можна, так бы мовіць, пакінуць грошы, аддаць іх у якасці плацяжоў. Зараз нялішне ведаць, што ў аддзяленнях сувязі можна афарміць адпаведныя дакументы і атрымаць іх у выглядзе крэдытаў — наяўнымі альбо на картку, — зазначыла начальнік аддзела плацяжоў Т. М. Цітавец. Да таго ж ва ўсіх аддзяленнях сувязі зараз можна пагашаць крэдыты.

Пакуль, зазначым, васьмі банкаў, але не выключана, што ў найбліжэйшы час гэта лічба зменіцца, як і многае іншае. Бо, згадзіцеся, зусім нядаўна яшчэ цяжка было нават уявіць, што замест аператара любыя плацяжы (зноў жа наяўнымі альбо з пластыкавых картак) у рэжыме рэальнага часу змогуць прымаць так званыя інфа-кіёскі, што перавод з Мінска ў Асіповічы (напрыклад) будзе ісці не некалькі дзён, а лічаныя гадзіны, што жыхары 17 гарадоў Беларусі змогуць выконваць так званыя міжрэгіянальныя плацяжы. Гэта значыць, што дзеці, якія жывуць у Мінску, аплачваючы свае камунальныя паслугі, змогуць паклапаціцца і тое ж зрабіць за бацькоў...

Свае дасягненні і ў выдавецкага цэнтра «Марка». За 15 гадоў нашымі спецыялістамі, як патлумачыў начальнік выдавецкага аддзела цэнтра А.А. Гайко, падрыхтавана 688 розных сюжэтаў (у тым ліку — чатыры мижнародных, сумесна з Расіяй, Украінай, Прыбалтыкай), выпускаюцца тэматычныя наборы, якія могуць стаць цудоўнымі сувенірамі. І наогул маркі нездарма называюць маленькімі паштовымі шэдэўрамі, сродкамі інтэлектуальных зносінаў між людзьмі. Прадукцыя нашай «Маркі», атрымаўшы ў тым ліку і міжнароднае прызнанне, карыстаецца шырокім попытам. Беларуская экспазіцыя традыцыйна прысутнічае на ўсіх найбуйнейшых выставах.

Іншымі словамі, пошта краіны знаходзіцца ў пастаянным развіцці — удасканальвае прывычныя паслугі, укараняе новыя, што адзначана ў тым ліку і Сусветным паштовым саюзам. Па выніках аўдыторскай праверкі, праведзенай у рамках праграмы сертыфікацыі паштовых адміністрацый па кіраванні якасцю, РУП «Белпошта» падтрымліваюць Сартыфікат залатога ўзроўню. Па выніках работы за 2006 год прадпрыемства атрымала «сярэбраны» ўзровень.

Чаго чакаць у далейшым?

— Мы настойліва працуем над тым, каб, скажам так, адысці, адмовіцца ад наяўных грошай, — патлумачыла намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірына Ігнацьеўна Саксонава. — Не толькі ў Мінску, але ўжо і ў іншых гарадах не толькі заробак, але і пенсіі пералічваюцца на пластыкавыя карткі. Гэта зручна. Асабліва ў летні час, калі многія з'язджаюць на дачы... Пенсіянеру не трэба ў пэўны дзень вяртацца ў горад, ісці ў аддзяленне паштовай сувязі. Не трэба і чакаць дома. За пластыкавымі карткамі будучыня. Мы цудоўна разумеем гэта і настойліва працуем над тым, каб з іх дапамогай не толькі гараджане, але і вяскоўцы маглі аплачваць усе паслугі. Гэта — патрабаванне часу, а значыць, гэта рэальна... Нерэальнай, прычым яшчэ летась, здавалася камп'ютарызацыя ўсіх паштовых аддзяленняў. Сёння гэты этап ужо пройдзены.

На прадпрыемстве, падкрэслівае Ірына Ігнацьеўна, працуюць цудоўныя людзі — улюбёныя ў сваю справу. А значыць, новыя паслугі, новыя вышыні ў нас наперадзе.

Валянціна ДОЎНАР.

«БРОНЗА» ДЛЯ ДЭБЮТАНТАК

Запомніце гэтыя імёны: Вольга Падабед, Надзея Дрозд, Кацярына Сныціна, Вікторыя Гаспер, Святлана Вольная, Наталля Ануфрыенка, Настасся Верамеенка, Алена Леўчанка, Наталля Марчанка, Таццяна Троіна, Наталля Трафімава (капітан), Марына Крэс. Менавіта гэтыя дзяўчаты праславілі нашу краіну на сёлетнім чэмпіянаце Еўропы па баскетболе. На дэбютным для сябе турніры ў Італіі беларускі адразу выйгралі бронзавыя медалі, і на радасцях прынялі душ з шампанскага.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў жаночую зборную Беларусі па баскетболе, якая стала бронзавым прызёрам чэмпіянату Еўропы ў Італіі.

У матчы за трэцяе месца падначаленыя Анатоля Буяльскага не дазволілі ўзысці на п'едэстал латышскім спартсменкам — 72:63. Нагадаю, што ў паўфінале нашы дзяўчаты ўступілі іспанкам — 54:70. На спаборніцтвах у Італіі беларускі паказалі ўнікальны вынік: раней ніводнай дарослай камандзе нашай рэспублікі не ўдавалася заваяваць узнагароды першынства Еўропы ў гульнявых алімпійскіх відах спорту, прычым наша дружына ўжо гарантавала сабе ўдзел у кваліфікацыйным турніры да Алімпіяды-2008 (туды прабіліся каманды, якія занялі з 2-га па 5-е месцы на ЧЕ-2007). Наймацнейшымі ж баскетбалісткамі кантынента сталі расіянкі, якія перамаглі ў фінале каманду Іспаніі — 74:68 (пераможцы аўтаматычна трапяць на летнюю Алімпіяду-2008). Цікава, што нашы ўсходнія суседкі паўтарылі сёлетняе дасягненне нацыянальнай мужчынскай зборнай сваёй краіны.

Ірына ПРЫМАК.

Сёння на прыёме ў Міністэрстве спорту і турызму жаночай зборнай Беларусі па баскетболе былі ўручаны значкі і пасведчанні майстроў спорту міжнароднага класа. Гэтага звання яны ўдастоены за выйгрыш бронзавых медалёў чэмпіянату Еўропы ў Італіі.

Трэнерам каманды Анатолю Буяльскаму і Рыгору Каленту, а таксама ўрачам, масажыстам і адміністратарам каманды былі ўручаны медалі НАК за ўклад у развіццё алімпійскага руху.

БЕЛТА.

Твае правы

БАНК ВАКАНСІЙ. КОЖНАМУ... БЯСПЛАТНА

3727 афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных на 20 324 вакансіі. Калі меркаваць толькі па гэтых лічбах, цяперашнюю сітуацыю на мінскім рынку працы напружанай назваць цяжка. Тым не менш, як давялося пераканацца падчас «прамой лініі» Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, пытанняў наконт магчымасцяў уладкавання застаецца па-ранейшаму нямала. Каго рэгіструюць у якасці беспрацоўнага, пры якіх умовах беспрацоўны мае магчымасць выйсці на пенсію раней за агульнаўсталяваны ўзрост, што з'яўляецца падставай для накіравання на прафесійнае перанавучанне, нарэшце, ці мае найменьнік права адмовіць у прыёме на работу з-за адсутнасці пасведчання дзяржаўнага сацстрахавання? Такім чынам, адказы на гэтыя і іншыя пытанні дае начальнік аддзела кантролю за выкананнем заканадаўства аб занятасці Эла Міхайлаўна АКУЛА.

Галоўнае пытанне — транспарт

Як вядома, зараз жыхары прылеглых да Мінска раёнаў могуць уладкоўвацца на працу ў сталіцы пры ўмове магчымасці штодзённых паездак на работу і вяртання на сталае месца жыхарства. Тым часам, якая мясцовасць лічыцца «прылеглай»? І ці ёсць «нормы» па колькасці кіламетраў?

— Нормаў па адлегласці па сутнасці няма, але ёсць рэальныя жыццёвыя сітуацыі, пры якіх кожнаму зразумела — зможа чалавек дабірацца да работы і вяртацца назад або не, — заўважае Эла Акула. — І першая акалічнасць, што бярэцца пад увагу ў дадзеным выпадку — транспартныя зносіны, наяўнасць рэгулярных аўтобусных маршрутаў ці пражыванне па лініі руху электрычкі. Але і тут могуць быць свае нюансы. Адна справа жыць у Дзяржынску ці Смалявічах, і зусім іншая — у Баранавічах ці Оршы. Чалавек павінен мець час не толькі на работу, але і на адпачынак, таму звычайна практыкуецца такі падыход: дарога ў абодвух напрамках не можа займаць больш за 4 гадзіны. Што да тэмы замены прапіскі на рэгістрацыю, то тут, адзначае Эла Акула, даваць тлумачэнні яшчэ рана. З улікам новай сітуацыі парадак працаўладкавання іншагародніх грамадзян у сталіцы плануецца вызначыць бліжэй да новага года.

Медзаключэнне зменяць... урачы

Пагаршэнне стану здароўя, на жаль, з'яўляецца адной з распаўсюджаных падстаў для звальнення. Бо не сакрэт: найменьнік абавязаны развітацца з супрацоўнікам, які мае медыцынскія проціпаказанні да выканання той і іншай работы. Аднак што рабіць, калі сам чалавек адчувае, што гэта работа яму па сілах? І якім чынам можна змяніць медыцынскае заключэнне?

— Змяніць медыцынскае заключэнне можна толькі праз новае абследаванне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі, — кажа Эла Акула. — Прычым калі чалавек з рашэннем МРЭК не згодны, то ён можа звярнуцца ў Міністэрства аховы здароўя. А ў выпадку нязгоды з міністэрствам — у пракуратуру ці іншыя кантралюючыя органы.

«Уласнае жаданне» падстава для... адмовы

Таксама няпростая сітуацыя. Арганізацыя жанчыны, якая знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, спыняе сваё існаванне. Ці можа такая жанчына зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнай ужо зараз?

— Статус беспрацоўнага дае права на перанавучанне, атрыманне падтрымкі на пачатак свайго бізнэсу, права на дапамогу (за выключэннем сітуацый, калі чалавек пры працоўным дагаворы на няпэўны тэрмін звольніўся па ўласным жаданні ці па пагадненні бакоў, або быў звольнены за нейкія вінаватыя дзеянні) па беспрацоўі, а таксама ў пэўных выпадках (пры ўмове нізкіх даходаў на кожнага члена сям'і) права на матэрыяльную дапамогу ў памеры 6 базавых велічынь у год, — зазначае Эла Акула. — Аднак паводле закона аб занятасці насельніцтва, беспрацоўнымі не могуць быць асобы, якія даглядаюць дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, навучаюцца на дзённай форме, займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, з'яўляюцца заснавальнікамі арганізацый, працуюць па грамадзянска-прававых дагаворах, праходзяць вайсковую службу. І, апроч таго, не рэгіструецца беспрацоўнымі моладзь ва ўзросце да 16 гадоў, асобы, якім прызначана пенсія па ўзросту ці за выслугу гадоў, грамадзяне, што лечацца ў ЛПП або адбываюць пакаранне ў выглядзе папраўчых работ, арышту і абмежавання ці пазбаўлення волі, грамадзяне, што свядома падалі несапраўдныя дакументы аб адсутнасці работы і зарплаты, а таксама выпускнікі бюджэтных аддзяленняў, якія адмовіліся ад размеркавання. Разам з тым усе гэтыя катэгорыі маюць поўнае права звярнуцца ў службы занятасці, дзе ім будзе аказана дапамога ў пошуку работы. У прыватнасці, на аднолькавых з беспрацоўнымі ўмовах яны могуць карыстацца гарадскім банкам даных вакансій як непасрэдна ў службах занятасці, так і праз Інтэрнэт — на сайце www. minsk.gov.by/rabota. Прычым у абодвух выпадках атрыманне гэтых звестак — цалкам бясплатная паслуга для ўсіх.

Інфармацыя сталічнай базы даных вакансій абнаўляецца штодня. Дарэчы, раяць у камітэце, магчымасцю звярнуцца да яе не павінны грэбаваць і ў тым ліку найбольш «праблемныя» катэгорыі — грамадзяне, якія не працавалі працяглы час, асобы ў перадпенсійным узросце, выпускнікі навучальных устаноў. А таксама... пенсіянеры.

— Выпадкі, калі падаюцца заяўкі менавіта на пенсіянераў, сустракаюцца не так ужо і рэдка, прычым, як правіла, гэта вакансіі з невысокай зарплатай, — працягвае Эла Акула. — Праўда, тут варта нагадаць адзін момант. Пры разліку пенсій пенсіянерам, якія працуюць, дзейнічае максімальны каэфіцыент заробку 1,3. Калі каэфіцыент большы і пенсіянер вырашыў уладкавацца на працу, то ён абавязаны паведаміць аб гэтым у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Бо ў адваротным выпадку давядзецца мець справу з «пераплатай» пенсіі. А пераплату давядзецца вяртаць.

Раней... калі няма работы

Супрацоўнік, якому засталося няшмат часу да пенсіі, можа патрапіць пад скарачэнне. Як такому супрацоўніку стаць на ўлік у службе занятасці? І ці зможа ён выйсці на пенсію раней за агульнаўсталяваны ўзрост?

— Для рэгістрацыі неабходна звярнуцца ў службу занятасці па месцы жыхарства і прынесці пэўны набор дакументаў — пашпарт, працоўную кніжку, дыплом аб адукацыі, даведку аб зарплаце. Прычым у выпадку скарачэння з моманту рэгістрацыі будзе прадастаўлена дапамога па беспрацоўю, — тлумачыць Эла Акула. — І наконт ранейшага афармлення пенсіі. У выпадку немагчымасці прапанавання варыянтаў працаўладкавання з улікам спецыяльнасці і вопыту работы, такое права ў беспрацоўных сапраўды ёсць. Аднак аб усіх нюансах тут лепш даведацца ў раённай службе занятасці насельніцтва.

Адсутнасць карткі — не праблема?

Чалавек доўгі час працаваў у Расіі і ў сувязі з гэтым не мае пасведчання дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Ці можа зараз адсутнасць «зялёнай карткі» стаць падставай для адмовы ў прыёме на работу ў Беларусі?

— Адсутнасць пасведчання дзяржаўнага сацыяльнага страхавання падставай для адмовы ў прыёме на работу не з'яўляецца, — падкрэслівае Эла Акула. — І падобная праблема вырашаецца даволі проста. Каб завесці пасведчанне, найменьнік, да якога ўладкоўваецца чалавек, павінен звярнуцца ў мясцовыя органы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Вучыцца ніколі не позна

Чым большы перапынак у рабоце, тым складаней знайсці месца. Аднак наколькі рэальна ў такім выпадку... увогуле змяніць спецыяльнасць? Ці магчымы такі варыянт, скажам, у 50-гадовым узросце?

— На прафесійнае навучанне ці перанавучанне беспрацоўны можа быць накіраваны выключна ў выпадку немагчымасці ўладкавання па спецыяльнасці, якая ўжо ёсць у яго зараз, — заўважае Эла Акула. — Аднак накіраванне даецца на набыццё не любых спецыяльнасцяў, а толькі тых, што карыстаюцца попытам на рынку працы. Гэта павялічвае шанцы атрымаць вакансію потым. І да таго ж тут ёсць яшчэ адзін варыянт: знайсці арганізацыю, якой патрэбны пэўны спецыяліст, і заключыць трохбаковую дамову — са службай занятасці, найменьнікам і беспрацоўным. Інакш кажучы, распачаць падрыхтоўку «пад канкрэтнае месца». Што ж да ўзросту, у якім чалавек можа быць накіраваны на прафесійнае навучанне ці перанавучанне, то тут ніякіх абмежаванняў няма. Паспрабаваць атрымаць новую спецыяльнасць магчыма і напярэдадні пенсіі.

Сяргей ГРЫБ.

Фата Анатоля КЛЕШЧУКА

Прыйсці, каб застацца

Будні аператара паштовай сувязі (ды на сталічным паштамце) — гэта тысячы твараў, тысячы няхай не вялікіх, але ж неадкладных кліенцкіх спраў: у некага прыняць плацяжы (грашовы перавод, пасылку...), некаму — афарміць падпіску, выдаць заказное пісьмо, прадаць канверты і паштоўкі, выслухаць, нешта параіць... Нялёгкая, зразумела ж, справа, але цікавая!

*Таму, напэўна, у працоўных кніжках многіх паштавікоў толькі адзін запіс: «прыняты на працу...» . **Тамара АЛЕКСЮТОВІЧ** і **Валянціна ЖДАНОВІЧ,** напрыклад, адразу пасля школы.*

І ўпэўнены, што гэта — ужо назаўсёды.

Ведай нашых!

Напісанае застаецца. Каб... уразіць

Сёлета пад эгідай Міжнароднага бюро Сусветнага паштовага Саюза (СПС) і ЮНЕСКА ў 36-ы раз праводзіўся эпісталярны конкурс. Гэта значыць, што мільёны маладых людзей (да 15 гадоў) з усіх куточкаў свету, згодна з зададзенай тэмай, пісалі (на гэты раз) мільёны лістоў людзям, жыхарам планеты ад імя... дзікай жывёліны, якой пагражае небяспека з-за змяненняў у прыродных умовах і клімаце...

У нашай краіне ўдзел у конкурсе бралі 1300 школ. У выніку на рэспубліканскі конкурс было прадстаўлена па аднаму сачыненню-пісьму ад кожнай вобласці, горада Мінска. І лепшым сярод іх (першае месца!) была прызнана работа пяцікласніка Іллянскай сярэдняй школы Вілейскага раёна Аляксея Гаўрыліка. Менавіта яго ліст і быў накіраваны ў горад Берн (Швейцарыя), каб нароўні з іншымі краінамі прадстаўляць нашу.

Днямі адтуль прыйшла добрая вестка: работа Іллі ўдастоена трэцяй заахвочвальнай прэміі, якая будзе ўручана хлопчыку ў Мінску на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Сусветнаму дню пошты. Апроч таго, для пераможцы і яго настаўніцы Таццяны Войцехаўны Філіповіч падрыхтаваны гаіаровыя дыпломы і каштоўныя падарункі ад РУП «Белпошта».

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.10.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 149,00
1 еўра	3 033,10
1 латвійскі лат	4 307,04
1 літоўскі літ	878,25
1 чэшская крона	110,14
1 польскі злоты	807,14
1 расійскі рубель	86,03
1 украінская грыўня	425,33

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	24,9800
10 UAH	49,5075
1000 BYR	11,6031
EUR	35,2693

Курс у гандлёвых кампаніях (на 8.10.2007 г.)
USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ISSN 1990 - 763X

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже ***в г. Бресте, ул. Красногвардейская, 129:*** **Лот № 1:** здание арматурного цеха с кран-балкой (об. пл. 427,0 кв.м). Нач. цена 290 000 000 бел. руб. с НДС. ***В г. Гомель, пер. Строителей, 3:*** **Лот № 2:** здание РБУ с наклонной галереей, емкостями для цемента, двумя бетоносмесителями и здание компрессорной, площадкой козлового крана, козловым краном (об. пл. 563,0 кв.м). Нач. цена 280 000 000 бел. руб. с НДС. **Лот № 3:** здание арматурного цеха с двумя мостовыми кранами, (об. пл. 2125 кв.м). Нач. цена 354 000 000 бел. руб с НДС. Размер задатка по каждому лоту составляет 10 % от начальной цены и перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Договор купли-продажи подписывается в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 16 октября 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 15 октября 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефоны: (8 017) 224 61 34, 334 56 23.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 3-х холодильных машин МКД-30-2-5 1985 г.в. Начальные цены: 3 920 067 бел. руб. с НДС за единицу. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с, указанный в условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 13.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны: (8 017) 224 61 34, (8 017 77) 161 29.
Наш сайт: www.rlt.by

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Логойском райисполкоме

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания склада снабжения (947,8 кв.м), расположенного по адресу: г. Логойск, ул. Победы, 79а. Начальная цена 237 661 164 бел. руб. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 13.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

В извещении о проведении открытого аукциона по продаже здания КПП № 2, расположенного: г. Слуцк, 1-й пер. Железнодорожный, 10, опубликованном в газете «Звязда» от 02.10.2007 г.,

ИЗМЕНЯЕТСЯ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА:

вместо 30 000 000 читать 24 600 000 бел. руб., а так же площадь земельного участка: вместо 1,1543 га читать 0, 0338 га.

Беларусь выступае за стварэнне паўнацэннага канкурэнтнага асяроддзя ў ЕўрАзЭС

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні Міждзяржаўнага савета Еўразійскага эканамічнага супольніцтва і сесіі Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, якія прайшлі 6 кастрычніка ў Душанбе.

Фота БЕЛТА.

Галоўны вынік саміту ЕўрАзЭС — падпісанне дакументаў па фарміраванні Мытнага саюза. На першапачатковым этапе Мытны саюз будзе будавацца з удзелам трох дзяржаў — Беларусі, Казахстана і Расіі. Плануецца, што ў далейшым да іх далучацца і іншыя члены — Кыргызстан, Таджыкістан і Узбекістан.

У рамках «тройкі» падпісаны Дагавор аб Камісіі Мытнага саюза, Дагавор аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванні Мытнага саюза, Пратакол аб парадку ўступлення ў сілу міжнародных дагавораў, што фарміруюць дагаворна-прававую базу Мытнага саюза, выхаду з іх і далучэння да іх. Зацверджаны План дзеянняў па фарміраванні Мытнага саюза ў рамках ЕўрАзЭС. У фармаце «шасцёркі» дзяржавамі — членамі Супольніцтва падпісаны Пратакол аб унясенні змяненняў у Дагавор аб заснаванні Еўразійскага эканамічнага супольніцтва ад 10 кастрычніка 2000 года. Мяркуецца, што Мытны саюз будзе рэальна створаны пасля таго, як будуць падпісаны і ратыфікаваны дадатковыя дакументы, прадугледжаныя базавымі пагадненнямі. Беларусь выступае за хутчэйшую рэалізацыю падпісаных дакументаў па фарміраванні Мытнага саюза і іх абавязковасць у выкананні.

Пазіцыя беларускага боку ў цэлым заключаецца ў тым, што краіны-ўдзельніцы павінны будаваць абсалютна раўнапраўны саюз у рамках ЕўрАзЭС, дзе было б створана паўнацэннае канкурэнтнае асяроддзе. А гэта немагчыма ва ўмовах няроўнасці цэнаў на важнейшыя сыравінныя тавары і энергарэсурсы. Акрамя таго, Беларусь лічыць важным прынцып раўнапраўя і захавання інтарэсаў усіх бакоў пры стварэнні наднацыянальных органаў у Супольніцтве.

На сустрэчы ў Душанбе былі вызначаны далейшыя крокі краін — удзельніц ЕўрАзЭС па стварэнні адзінай эканамічнай прасторы, што забяспечвае свабоднае перамяшчэнне тавараў і паслуг, правядзенне ўзгодненай эканамічнай палітыкі. Кіраўнікі дзяржаў намецілі меры па актывізацыі ўзаемадзеяння ў сферы стварэння агульнага энергетычнага рынку, пашырэння міжнароднай дзейнасці ЕўрАзЭС і ўмацавання яго структуры. Новым генеральным сакратаром ЕўрАзЭС назначаны прадстаўнік Казахстана Таір Мансураў.

Насычаную двухдзённую работу прэзідэнтаў у Душанбе завяршыла сесія Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, на якой былі вызначаны асноўныя напрамкі развіцця Арганізацыі на бліжэйшую перспектыву. Прэзідэнт Беларусі, адкрываючы пасяджэнне Савета ў вузкім складзе, падкрэсліў, што задачы, пастаўленыя перад АДКБ у мінулым годзе на саміце ў Мінску, у цэлым выкананы. Сумеснымі намаганнямі краіны змаглі дабіцца вырашэння многіх пытанняў, у тым ліку і тых, якія рыхтаваліся на працягу некалькіх апошніх гадоў. «Аднак шэраг новых праблем, што стаяць перад АДКБ, чакае свайго вырашэння», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Завяршаючы старшынства ў статутных органах АДКБ, беларускі бок падзякаваў дзяржавам-членам за падтрымку і актыўны ўдзел у дасягненні агульных мэтаў. «Спадзяюся, што пазітыўныя напрацоўкі, зробленыя ў час беларускага старшынства, атрымаюць сваё развіццё і працяг», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да калег.

Беларусь лічыць важным устанаўленне нацыянальнага кантролю за рэалізацыяй рашэнняў, што прымаюцца ў Арганізацыі, а таксама ўвядзенне адзінага парадку працэдуры падрыхтоўкі, прадстаўлення і ўзгаднення дакументаў. У цэлым Беларусь прытрымліваецца прынцыпу няўхільнага выканання ўсіх дамоўленасцяў, дасягнутых дзяржавамі АДКБ. У гэтых мэтах на нацыянальным узроўні прымаюцца ўсе неабходныя меры.

У Беларусі ў поўным аб'ёме выконваецца План асноўных мерапрыемстваў па ўсебаковаму ўмацаванню міждзяржаўнага супрацоўніцтва, фарміраванню і развіццю сістэмы калектыўнай бяспекі на 2006—2010 гады. У Душанбе старшынства ў АДКБ перайшло Кыргызстану. На саміце кіраўнікі дзяржаў канстатавалі: за час свайго існавання Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы ператварылася ў дзейсную і аўтарытэтную структуру, з якой лічацца ў свеце.

Сур'ёзную ўвагу прэзідэнты ўдзялілі ваенна-тэхнічнаму супрацоўніцтву. Дасягнута дамоўленасць аб тым, што краіны АДКБ змогуць купляць расійскія ўзбраенні і спецтэхніку для ўзбраення сіл і спецслужбаў па ўнутраных расійскіх цэнах. У юбілейнай дэкларацыі ў сувязі з 15-годдзем Дагавора аб калектыўнай бяспецы падведзены асноўныя вынікі работы Арганізацыі па забеспячэнні міру і стабільнасці ў зоне яе адказнасці, выкладзены прыярытэтныя напрамкі яе дзейнасці.

Чарговыя саміты ЕўрАзЭС і АДКБ пройдуць у Маскве ў маі—чэрвені 2008 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З ПРАБЛЕМАМІ — ДА ЮРЫСТА

Дзень прыёму грамадзян наладзілі днямі ў некалькіх сталічных ВНУ — БДУ, БДЭУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Разбіраліся ў праблемах наведвальнікаў супрацоўнікі Вышэйшага Гаспадарчага суда і агульных судоў, Камітэта дзяржкантролю, пракуратуры. Паўдзельнічала ў прыёме на юрыдычным факультэце БДУ і карэспандэнт «Звязды».

Сталічных грамадзян, як высветлілася, турбуюць праблемы, звязаныя з падзелам нерухомай маёмасці — кватэры, дома, летніку ці гаража — з рознымі варыяцыямі на тэму: адны імкнуцца размежаваць пакоі ў кватэры, іншыя — пладовы сад... Што самае недарэчнае, спрачаюцца часцей за ўсё блізкія сваякі: бацькі і дзеці, браты і сёстры, мужы і жонкі. Ледзь не з боем дзеліцца спадчына, і чым яна буйнейшая, тым, як правіла, больш жорсткая барацьба за яе.

У наведвальнікаў не заўсёды аказваліся пры сабе неабходныя дакументы на маёмасць, таму высветліць, хто і на што можа прэтэндаваць, часта было складана — юрыстам даводзілася пралічваць усе магчымыя варыянты. Кагосьці спецыялісты абнадзейвалі: «У вашым выпадку можна вырашыць праблему і без суда», іншых вымушаны былі расчараваць: «Спрэчка бесперспектыўная». Давайце паслухаем, з якімі праблемамі прыходзілі людзі.

Свякроў нявесткі не таварыш

Цікава, што ледзь не кожная другая наведвальніца — свякроў. Яна «клапоціцца» пра тое, што нявестка (цяперашняя ці будучая), пасяліўшыся ў жылое памяшканне, уласнікам якога з'яўляецца свякроў, будзе прэтэндаваць на ўласнасць у гэтым жылым памяшканні ў выпадку скасавання шлюбу. Як вырашыць такую праблему, расказае **суддзя Мінскага гарадскога суда Алена ТРОСКА:**

— Пры ўсяленні ў кватэру ні нявестка, ні хто-небудзь іншы не набывае права ўласнасці. А вось што датычыцца права карыстання жылым памяшканнем, то паводле агульнага правіла (артыкулы 30, 57, 110, 116 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь) права карыстання жылым памяшканнем нароўні з наймальнікам (калі жыллё дзяржаўнае) ці ўласнікам (у іншых выпадках) маюць члены яго сям'і, калі яны ўсяліліся ў гэта памяшканне ва ўстаноўленым Жыллёвым кодэксам парадку, гэта значыць згодна з пісьмовым пагадненнем усіх паўналетніх жыльцоў, якія маюць права карыстання канкрэтным жылым памяшканнем. Закон таксама прадугледжвае пісьмовае пагадненне аб іншым парадку карыстання жылым памяшканнем, што можа спатрэбіцца ў вырашэнні праблемы свякроў—нявестка.

Кватэра за апеку?

Да нашых спецыялістаў звярталіся апекуны, якіх цікавіла, ці могуць яны прэтэндаваць на кватэру недзеяздольнага падапечнага.

— Апякун, які пражывае ў кватэры падапечнага, паводле артыкула 90 Жыллёвага кодэкса, не набывае права карыстання жылплошчай і тым больш, права ўласнасці, — даводзіла Алена Мікалаеўна. — Аднак пасля спынення апекі ці папячыцельства апякун можа ў судовым парадку паспрабаваць даказаць, што ён стаў для падапечнага членам сям'і: пасля спынення апекі ці папячыцельства яны доўгі час жывуць разам, вядуць сумесную гаспадарку і гэтак далей. Аднак гэта задача не з лёгкіх.

Арыфметыка прыватызацыі

У суцэльны матэматычны алгарытм ператварылася вырашэнне праблемы адной наведвальніцы. Дадзена: у непрыватызаванай кватэры прапісаны і пражываюць жанчына і яе сын, без прапіскі пражывае нявестка. Жанчына хоча прыватызаваць два пакоі на сябе і адзін на сына.

— Для гэтага трэба аформіць іск аб змяненні дагавора найму і выдзяленні ў карыстанне тых канкрэтных пакояў, — кансультуе Алена Троска, — аднак нявестка можа прад'явіць сустрэчны іск аб устанаўленні права карыстання жылым памяшканнем, паколькі яна знаходзіцца ў шлюбе з вашым сынам і вядзе з ім сумесную гаспадарку, і тады ўжо давядзецца размяркоўваць жылую плошчу ў разліку не на дваіх, а на траіх.

— А што калі я выйду замуж? — цікавіцца жанчына.

— Калі муж будзе заселены ва ўстаноўленым парадку (з пісьмовай згоды ўсіх паўналетніх жыльцоў кватэры), ён таксама ўступае ў права карыстання жылой плошчай, як і ваша нявестка, а значыць плошчу кватэры прыйдзецца разлічваць ужо на чацвярых. Ва ўсякім разе суд можа адмовіць вам у змяненні дагавора найму, калі плошча жылых пакояў, якія вы хочаце атрымаць у карыстанне, значна перавышае долю, належную вам па закону (скажам, з 40 квадратных метраў на чацвярых вы замест належных вам па закону 10 квадратных метраў, патрабуеце 17-метровы пакой), паколькі гэта ўшчамляе інтарэсы іншых асобаў.

— Нявестка не дае мне жыцця, ці можна яе выселіць?

— Гэта магчыма паводле падстаў, прадугледжаных у артыкуле 39 Жыллёвага кодэкса. Можна звярнуцца з іскам у суд, саслаўшыся на тое, што нявестка ўсялілася без вашай згоды.

Шлюб скасавалі — прапіска засталася

У адной з наведвальніц была такая праблема:

— Мы з мужам разышліся, жывём асобна, і мяне турбуе, што калі шлюб будзе скасаваны, ён мяне выпіша...

Юрысты пераканалі жанчыну, што на прапіску гэта не паўплывае. Аднак, калі жанчына выехала з той кватэры, дзе прапісана, і мае іншае пастаяннае месца жыхарства, суд можа прызнаць яе страціўшай права карыстання жылым памяшканнем у сувязі з выбыццём на іншае пастаяннае месца жыхарства (частка 2 артыкула 37 Жыллёвага кодэкса). Пры вынясенні такога рашэння суда прапіска будзе анулявана.

Цікава, як будуць вырашацца праблемы такога плана пасля ўвядзення рэгістрацыі? Гэта пытанне пакуль застаецца адкрытым. Затое многія іншыя, у нечым нават лёсавызначальныя для наведвальнікаў, пытанні былі высветлены. Няхай у Мінску такія грамадскія прыёмныя і не карыстаюцца неверагодным попытам, тым не менш, карысць яны прыносяць: грамадзяне і паскардзіліся, і пракансультаваліся, і грошы зэканомілі.

Ала МАЧАЛАВА.

Уся справа ў яйках?

У Вярхоўным Судзе разглядаецца грамадзянская справа аб ахове аўтарскага права паэта Алеся Разанава і мастака Віктара Маркаўца. Дзеячы культуры сцвярджаюць, што іх сумесны жывапісны твор без іх згоды быў перапрацаваны і выкарыстаны для абазначэння паслуг СТАА «МТС», у сувязі з чым яны патрабуюць ускласці на адказчыка (кампанію МТС) абавязак апублікаваць у шэрагу СМІ звесткі пра дапушчаныя парушэнні.

Прэтэнзіі Алеся Разанава і Віктара Маркаўца датычаць праекта «Яйкаквадраты», які быў створаны амаль 15 гадоў таму і паводле вызначэння саміх аўтараў з'яўляецца мастацка-канцэптуальным — акрамя жывапіснага ўвасаблення ёсць таксама філасофская канцэпцыя, якая паслядоўна разгортваецца ў шасці палотнах з выявамі яек, форма якіх адпавядае авалу. Паводле слоў аўтараў, яны ўдваіх удзельнічалі ва ўсіх стадыях стварэння жывапісных палотнаў, нягледзячы на тое, што паэт Алесь Разанаў раней мастацтвам не займаўся.

Шэсць квадратных метровых палотнаў, выкананых у бела-чорна-чырвонай гаме, дэманстраваліся на выставах, ім прысвячаліся публікацыі ў газетах і часопісах, а таксама тэлефільм, творы былі прадстаўлены ў Інтэрнэце, з'яўляліся яны і на вокладках кніг Алеся Разанава, у прыватнасці, на кнізе пад назвай «Каб мелі шчасце ўваскрасаць і лётаць». Менавіта там у чырвоным квадраце размешчана белае яйка, якому надана так званая «ідэальная» форма авалу і якое стала прадметам судовай спрэчкі.

Аўтары «Яйкаквадратаў» мяркуюць, што іх творы (акрамя вышэй згаданага яйка прэтэнзіі да МТС прад'яўляюцца і наконт чырвонага яйка на белым фоне, такі варыянт афарбоўкі таксама выкарыстоўваецца кампаніяй, праўда, значна больш рэдка, чым адваротны — такім чынам, нібыта перароблены яйкаквадраты другі і трэці ў шэрагу шасці прац, што звязаны адна з адной, аднак пры гэтым, паводле слоў Алеся Разанава і Віктара Маркаўца, з'яўляюцца самастойнымі творамі) былі выкарыстаны цалкам (элементы, каляровая гама) з лёгкай зменай — верх яйка трошкі завостраны. Пра адрозненні ў размяшчэнні яйкаў у квадратах аўтары мастацка-канцэптуальнага праекта кажуць, што яно (размяшчэнне) не мае значэння і ў залежнасці ад задумы экспазіцыі можа змяняцца. Тым не менш аўтары яйкаў авальнай формы ў квадратах адзначаюць, што паводле разгортвання філасофскай канцэпцыі, якая звязана з праблемамі жыцця, смерці, наогул існавання чалавека, быцця, зменаў, развіцця «Яйкаквадраты» павінны размяшчацца гарызантальна. Прынамсі, на вокладцы кнігі Алеся Разанава «Каб мелі шчасце ўваскрасаць і лётаць» яйка ў квадраце размешчана таксама гарызантальна.

Кампанія МТС не з'яўляецца ўладальнікам таварнага знака з выявай яйка, а толькі карыстаецца ім з дазволу расійскай кампаніі «Сістэма тэлекамунікацый, інфарматыкі і сувязі», распрацоўкай лагатыпу для якой займалася брытанскае прадпрыемства.

Варыяцыі на тэму яйкаў і квадратаў сустракаюцца не толькі ў Алеся Разанава і Віктара Маркаўца ды кампаніі МТС: гэтыя ж элементы былі выкарыстаны ў лагатыпах многіх замежных фірмаў — іспанскай «Huevo duro» («Крутыя яйкі»), бельгійскай «Ovofood» («Яйкавая ежа») і іншых. Судовы разбор працягваецца: па хадайніцтве істцоў аб'яўлены перапынак да 10 кастрычніка ў сувязі з неабходнасцю азнаёміцца з дакументамі, якія падаў адказчык, а таксама ўдакладніць іскавыя патрабаванні.

Ала МАЧАЛАВА.

П'яны збіў жанчын і з'ехаў

Каля дзевяці гадзін увечар нецвярозы вадзіцель «Аўдзі-80» на прасельнай дарозе каля вёскі Цвеціна Міёрскага раёна наехаў на дзвюх жанчын, якія шлі па краю дарогі ў тым жа накірунку. Флікеры на адзенні пешаходаў адсутнічалі. У выніку ДТЗ 58-гадовая пенсіянерка — мясцовая жыхарка загінула на месцы аварыі, а 30-гадовая беспрацоўная, якая ішла побач, атрымала розныя траўмы. Вадзіцель з месца ДТЗ знік. Меней чым праз паўгадзіны ў ходзе рэалізацыі спецыяльнага плана «Перахоп» ля вёскі Калатушкава машыну затрымалі супрацоўнікі аддзела ДАІ Полацкага РАУС.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, Ігар ШЧУЧЭНКА.

Штодня супрацоўнікамі ДАІ затрымліваецца больш за 200 нецвярозых вадзіцеляў

Найбольш аварыйнымі месяцамі гэтага года, паводле даных Упраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў, сталі студзень (653 ДТЗ), чэрвень (686), ліпень (752), жнівень (721). Найбольш аварыйнымі днямі тыдня зафіксаваны субота і нядзеля, у якія, адпаведна, адбываліся 16 і 17 працэнтаў дарожна-транспартных здарэнняў.

Увогуле за восем месяцаў на дарогах краіны адбылося 4699 дарожна-транспартных здарэнняў (на 2 працэнты менш, чым ў 2006 годзе). У іх 929 чалавек загінулі (906 загінулых у 2006 годзе), былі паранены 5097 чалавек (5262 чалавекі атрымалі раненні за 8 месяцаў папярэдняга года). ДТЗ са смяротным зыходам, паводле даных ДАІ, складаюць больш за 15 працэнтаў ад агульнай колькасці ДТЗ з пацярпелымі.

Па віне вадзіцеляў, якія кіравалі транспартным сродкам у нецвярозым стане, здзейснена 539 ДТЗ (на 7 працэнтаў менш, чым у 2006 годзе). З гэтай колькасці каля 23 працэнтаў ДТЗ здзейснены на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, 20 працэнтаў — Мінскай, каля 16 працэнтаў — Гомельскай вобласці. На працягу гэтага года штодня за кіраванне транспартам у стане алкагольнагаап'янення супрацоўнікамі ДАІ затрымлівалася больш за 200 вадзіцеляў.

З удзелам дзяцей сёлета адбылося ўжо 505 ДТЗ. Пры гэтым 53 дзіцяці загінулі, а 490 атрымалі раненні. Каля паловы дзяцей удзельнічалі ў ДТЗ у якасці пешаходаў, 35 працэнтаў — пасажыраў, больш за 15 працэнтаў — у якасці веласіпедыстаў.

Амаль трэць ад усіх здарэнняў звязана з парушэннем вадзіцелямі транспартных сродкаў хуткаснага рэжыму і правілаў манеўравання. У прыватнасці, у 69 працэнтах выпадкаў віноўнікамі здарэнняў станавіліся вадзіцелі легкавых і грузавых аўтамабіляў (652 чалавекі загінулі і 3769 атрымалі раненні). З кожным годам павялічваецца колькасць вадзіцеляў транспартных сродкаў, якія пакідаюць месца ДТЗ. За восем месяцаў года кожны восьмы вадзіцель — віноўнік ДТЗ (604 чалавекі) зрабіў менавіта так. Найбольш распаўсюджанымі відамі ДТЗ ад іх агульнай колькасці з'яўляюцца наезд на пешахода (39 працэнтаў), сутыкненне транспартных сродкаў (32 працэнты), перакульванне транспартных сродкаў (15 працэнтаў), наезд на перашкоду (10 працэнтаў), наезд на веласіпедыста (8 працэнтаў). Сёлета таксама зарэгістравана сем выпадкаў сутыкнення транспартных сродкаў з рухомым саставам чыгункі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Машыны адкінула з дарогі

32-гадовы мінчанін, які знаходзіўся за рулём «Аўдзі-100», не справіўся з кіраваннем і сутыкнуўся з «БМВ», што рухаўся ў спадарожным напрамку па Партызанскім праспекце сталіцы. Машыны адкінула за межы праезнай часткі, дзе «Аўдзі-100» уехала ў асвятляльную мачту і дрэва. Вадзіцель апошняй машыны загінуў на месцы здарэння, яе ж пасажыр, а таксама кіроўца «БМВ», 39-гадовы мінчанін, змешчаны ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

«АНАДЫР» У КАРЫБАХ

У Мінску адзначылі 45-годдзе Карыбскага крызісу. Тады свет ушчыльную наблізіўся да развязвання трэцяй сусветнай атамнай вайны

З гэтай нагоды ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі адбылася сустрэча супрацоўнікаў Пасольства Кубы з грамадскасцю беларускай сталіцы і ўдзельнікамі тых далёкіх падзей, якія сёння жывуць у нашай краіне. Людзі сталага пакалення выдатна памятаюць тыя драматычныя падзеі кастрычніка 1962 года. Тады толькі ўдалая дыпламатыя, рэалізм і адказнасць кіраўнікоў СССР і ЗША дапамаглі пазбегнуць ваеннага канфлікту паміж дзвюма звышдзяржавамі.

Цяпер, вядома, яны — ветэраны-інтэрнацыяналісты былі ў цэнтры ўвагі на сустрэчы ў іх гонар. Кубінскі пасол у Мінску Амар Кінтэра ? ў сваім выступленні высока ацаніў уклад нашых суайчыннікаў у справу пераадолення кастрычніцкага крызісу, які потым атрымаў назву Карыбскага. Ён быў шчыры на добрыя словы і эпітэты ў адрас гэтых людзей, якія за многія тысячы кіламетраў ад Радзімы гатовыя былі аддаць самае дарагое — жыццё ў імя ідэалаў свабоды, свайго інтэрнацыянальнага абавязку. І кубінцы ніколі не забудуць іх подзвіг. Больш за тое, яны выдатна засвоілі ўрокі інтэрнацыяналізму сваіх савецкіх сяброў і аднадумцаў. Многія кубінцы, напрыклад, добраахвотнікамі паехалі змагацца супраць рэжыму апартэіду ў Афрыцы. Кубінскі пасол агучыў такую лічбу: сёння 40 тысяч кубінскіх урачоў працуюць у асноўным бясплатна ў амаль 100 краінах свету. Многія тысячы жыхароў Лацінскай Амерыкі прайшлі курс лячэння на Кубе.

Дзмітрый Сянько, старшыня аб'яднання воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія служылі на Кубе, у 1962 годзе свой інтэрнацыянальны абавязак выконваў у якасці афіцэра ракетных войскаў. Ён гаварыць, што аперацыя дастаўкі на Кубу савецкіх вайскоўцаў і баявой тэхнікі пад назвай «Анадыр» была праведзена бліскуча. На «востраў свабоды» ўдалося пад носам у амерыканцаў перакінуць 43 з паловай тысячы салдат і афіцэраў, вялікую колькасць зброі, у тым ліку і ракетнай. Зараз гэта аперацыя вывучаецца ў вышэйшых ваенных навучальных установах Расіі і іншых краін.

І сапраўды, паводле слоў нашых беларускіх кубінцаў — удзельнікаў таго надзвычай вострага абастрэння супрацьстаяння Савецкага Саюза і ЗША, ім давялося сутыкнуцца з жорсткімі выпрабаваннямі. На Кубу плылі 15—17 сутак у трумах караблёў, спякота там стаяла невыносная. Многія пакутавалі ад марской хваробы. Ды і на востраве была даволі цяжкая служба. Вельмі заміналі своечасовай устаноўцы 44 ракет моцныя кастрычніцкія трапічныя лівні. Пад няспынным дажджом часам у вельмі сцісłыя тэрміны даводзілася рыхтаваць да адпору верагоднай агрэсіі амерыканцаў. А ў сонечны дзень, калі выпадкова дакранешся да брані танка, адразу атрымліваешь моцны апёк. На жаль, не ўсе вытрымлівалі выпрабаванняў. Некаторых па марскіх правілах пахавалі яшчэ ў час плавання, іншых — у зямлі Кубы.

Сёння Куба, нагадаем — аўтарытэтны член Руху недалучэння, адзін з асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі ў Лацінскай Амерыцы. Узаемны тавараабарот пастаянна расце. Беларусь пастаўляе на Кубу прадукцыю машынабудаўнічага комплексу — грузавыя аўтамабілі, трактары, рухавікі, кар'ерныя самазвалы, кузавы для аўтамабіляў, запчасткі, а таксама шыны. Галоўны тавар кубінскага імпарту — цукар.

Леанід ТУГАРЫН.

Гульня № 1

«ТАРПЕДА» МОЖА ТРАПІЦЬ НА П'ЕДЭСТАЛ

Зусім мала часу засталося да фінішу чэмпіянату Беларусі па футболе. Пакуль пасля 22-га тура становішча ў тройцы лідараў наступнае: БАТЭ — 49 ачкоў (матч у запасе), МТЗ-РІПА — 38, «Тарпеда» — 36, прычым калі жодзінцы захаваюць за сабой месца на п'едэстале — гэта будзе вялікім поспехам для каманды. Вынікі сустрэч: «Смаргонь» — «Нафтан» (Наваполацк) — 1:1, «Нёман» (Гродна) — «Дынама» (Брэст) — 1:0, «Тарпеда» (Жодзіна) — «Дарыда» (Мінскі раён) — 4:2, «Мінск» — МТЗ-РІПА (Мінск) — 1:2, «Днепр» (Магілёў) — «Дынама» (Мінск) — 1:1, «Віцебск» — «Гомель» — 0:0, БАТЭ (Барысаў) — «Шахцёр» (Салігорск) — 1:0.

Ірына АНАТАВА.

К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «УНИВЕРСАМ ЗАСЛАВЛЬ»

19 ОКТЯБРЯ 2007 ГОДА В 13.00

состоится внеочередное общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, д. 49

Регистрация участников с 12.00 до 12.55

Повестка дня:

1. О сделках Общества.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, д. 49; в период с 9 октября 2007 г. с 10.00 до 16.00, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Телефон для справок (017) 226 61 90.

Наблюдательный совет.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже административно-производственного здания (734, 8 кв.м), расположенного по адресу: г. Орша, ул. Белинского, 1а. Площадь земельного участка 0,2240 га. Начальная цена снижена на 40 % и составляет — 167 070 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.06.2007 г. Аукцион состоится 18.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.10.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

ОАО «Паритетбанк» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

проводят открытый аукцион по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.

Номер лота	Номер машиноместа	Общая площадь, кв. м	Начальная цена, бел. рубли.	Сумма задатка, бел. рубли.
1.	1.	12.8	24 380 928	2 438 093
2.	2.	11.9	22 666 644	2 266 664
3.	3.	11.9	22 666 644	2 266 664
4.	4.	11.9	22 666 644	2 266 664
5.	5.	11.9	22 666 644	2 266 664
6.	6.	12.0	22 857 120	2 285 712
7.	7.	12.0	22 857 120	2 285 712
8.	9.	12.2	23 238 072	2 323 807
9.	13.	12.2	23 238 072	2 323 807
10.	16.	12.5	23 809 500	2 380 950
11.	17.	12.5	23 809 500	2 380 950
12.	20.	12.5	23 809 500	2 380 950
13.	21.	12.5	23 809 500	2 380 950
14.	22.	12.5	23 809 500	2 380 950
15.	27.	12.5	23 809 500	2 380 950
16.	28.	12.5	23 809 500	2 380 950
17.	29.	11.7	22 285 692	2 228 569
18.	30.	11.7	22 285 692	2 228 569
19.	37.	9.6	18 857 120	1 885 712
20.	38.	9.6	18 857 120	1 885 712
21.	39.	9.6	18 857 120	1 885 712
22.	40.	9.6	18 857 120	1 885 712
23.	41.	9.6	18 857 120	1 885 712
24.	42.	9.6	18 857 120	1 885 712
25.	43.	9.6	18 857 120	1 885 712
26.	44.	9.6	18 857 120	1 885 712
27.	45.	10.6	20190 456	2 019 046
28.	46.	10.2	19 428 552	1 942 855

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» №3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение календарных 3 дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Аукцион состоится 23 октября 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 22 октября 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: 227 48 36, 227 40 22 — УП «Минский городской центр недвижимости»

Простыя рэчы

ПЛЯЦ

Фота Анатоля КЛЫШЫЦКАГА.

Купалаўская вёска Харужанцы.

Слова гэта з нямецкай мовы (Platz). І ў беларускай мове мае некалькі значэнняў. Мне дык найбліжэй з іх тое, што азначае **зямлю пад сядзібай, саму сядзібу**. Наш пляц, суседні пляц. Бацькі перабраліся ў Паставы ў 1952-м. Для будаўніцтва дома ім выдзелілі пляц зусім недалёка, метраў пяцьсот ад цэнтральнай плошчы (пра плошчу пагаворым асобна) райцэнтра. Тады ж гарадок быў невялікі, на некалькі тысяч жыхароў, і новыя вуліцы толькі-толькі пачыналі распаўзацца ад цэнтра. Але які гэта быў пляц. Яміны, а дзе і проста кучы смецця. Давялося ўсё выраўноўваць, навозіць пяску. Цяпер, праз дзесяцігоддзі, зямелька на пляцы перарабілася, родзіць, як і ў суседзяў, якім таксама дасталіся не лепшыя пляцы. Ды гэта — дзякуючы немалым высілкам людзей. І сёння ў Паставах шырока вядзецца індывідуальнае будаўніцтва, узніклі дзесяткі і дзесяткі новых вуліц. Пляцы выдзяляюцца там, дзе некалі былі нівы найбліжэйшых калгасаў. Выдзяляюцца пляцы і пад дачныя ўчасткі. Асаблівым попытам карыстаюцца яны ў вёсках, якія раскінуліся над шматлікімі ў нашым краі азёрамі. Прычым ахвотных прыдбаць сабе ўчастак пад будаўніцтва дачы цікавіць толькі той пляц, які мае выхад да вады. Зразумела, для адпачынку гэта вельмі прыдатна. Але некаторыя новыя забудоўшчыкі лічаць, што, атрымаўшы пляц над возерам, яны займелі права і на адпаведны кавалак берага гэтага возера. Высозныя платы ставяцца да самай вады, а то заганяюцца і ў ваду на пару метраў. Гэта пярэчыць заканадаўству аб ахове прыроды. З гэтым пачалі змагацца, у тым ліку і ў нас, на Віцебшчыне.

Яшчэ адно значэнне пляца — вялікая, незабудаваная тэрыторыя ў горадзе ці вёсцы, пакінутая з нейкай мэтай. Ёсць у беларускай мове і распаўсюджаны адпаведнік назвы — **плошча**. Яны існуюць сёння побач — **пляц і плошча.** Мы, выхаваныя ў савецкіх школах, прызвычаіліся, гаворачы пра Маскву, называць: «Красная плошча». Хоць бы дараіла — «чырвоная». І ўсё-такі пляц — больш па-беларуску.

У Анатоля Астрэйкі:

Жывой гамонкай да світання
Пляцы і вуліцы гулі.

А ў паэме Максіма Танка «Кастусь Каліноўскі» пляц у Вільні, дзе прыняў смерць наш нацыянальны герой, займае немалую частку твора. Збіраюцца на месца выканання жорсткага прысуду людзі, і вось адзін прахожы звяртаецца да другога:

Прашу мне дараваць, гаспадзін,
Ці не можна ў вас аганьку?
Вы на пляц ідзяце так, адзін?..

Адарвуся ад асноўнай тэмы і звярну ўвагу на тое, як паэт у адной фразе азначыў псіхалагічную сітуацыю таго часу. Паўстанне падаўлена, зараз адбудзецца пакаранне галоўнага яго завадатара, з новай моцай у краі запанавала царская ўлада. І мешчанін звяртаецца да сустрэчнага ўжо не «пан» ці «спадар», а «гаспадзін». Ён схіліў галаву перад непазбежнай рэчаіснасцю.

Прысутнічае ў беларускай мове і такая назва пляца ў гэтым значэнні — майдан. Ва Украіне яно пераважае. Мы цяпер часта чуем гэта слова, калі слухаем і глядзім палітычныя навіны з Кіева. А слова гэта прыйшло да славян з арабскай мовы — majdan.

У старой беларускай мове для азначэння такога пляца існавала яшчэ і слова ток. Ды ўспомнім беларускія казкі. Калі сыходзіліся асілкі, то перш чым біцца, яны рабілі сабе **ток**, месца, дзе будуць біцца. А ў вёсках пляцкі для забаў дзяцей называлі тачкамі. З гістарычнай літаратуры ведаем: Стралецкі тачок у Полацку, дзе быў стралецкі замак; Княжы тачок, перад замкам у Навагрудку.

А вось гэта значэнне слова пляц блізкае мне па гадах вайсковай службы — **плошча для ваенных парадаў і страявых заняткаў.** Так, за час службы нам вельмі шмат часу даводзілася праводзіць на пляцы. Спачатку, маладзёнкамі, засвойвалі тут азы страявой падрыхтоўкі, як сказаў бы наш славуты навуковец Вацлаў Ластоўскі — шыхтавання. Вучыліся, як правільна стаяць, паварочвацца, як «цягнуць» нясок бота ў час урачыстага кроку. А потым на працягу ўсёй службы перад кожнымі святамі 1 Мая і 7 Лістапада трэніраваліся тут у «каробках» па сто чалавек да ўрачыстых парадаў на плошчы ў Мінску. Няпростая гэта справа — кожны вечар па нек

Уладзімір БЕЛАХВОСТАЎ:

«МЫ — ТАКСАМА ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ТОЛЬКІ ДЗЯРЖАЎНЫЯ»

Жыллёва-камунальная гаспадарка плануе актыўна ствараць вытворчасць, наладжваць унутраны гандаль і экспарт уласнай прадукцыі. Сёння яе структуры займаюцца больш чым сямюдзесяццю відамі дзейнасці. Акрамя аказання «традыцыйных» камунальных паслуг, кожная з арганізацый мае ўласныя заданні па дадатковых відах дзейнасці і стварэнні «нетрадыцыйнай» для ЖКГ прадукцыі.

Аб тым, што камунальнікам надышоў час зарабляць валюту, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Белахвостаў расказаў у час прайшоўшай у Жодзіне тэхніка-эканамічнай нарады, на прыкладзе работы сталярнага цэха гарадскога ўнітарнага прадпрыемства «Аб'яднанне жыллёва-камунальнай гаспадаркі». Зараз цэх вырабляе і цалкам забяспечвае горад неабходнымі для рамонту жыллёвага фонду агароджамі, дзвярыма, вокнамі. Сабекошт яго прадукцыі прыблізна на 60 працэнтаў меншы за той, што прапаноўваецца на рынку.

— Краіна не мае сваіх энергарэсурсаў, цана за газ павялічылася. Таму трэба шукаць крыніцы атрымання прыбытку. Добра, што ўласны невялікі дрэваапрацоўчы цэх у Жодзіне, дзе працуе пяць—шэсць чалавек, забяспечвае гарадскую камунальную гаспадарку таннай уласнай прадукцыяй, і дзяржаўных сродкаў выдаткоўваецца менш, — тлумачыць Уладзімір Белахвостаў. — Жыллёва-камунальная гаспадарка з'яўляецца шматпрофільным прадпрыемствам, і зараз, якія б праграмы яна ні распрацоўвала, якія б задачы ні ставіла, уся яе дзейнасць будзе разглядацца праз прызму «а колькі гэта прынясе прыбытку?».

— Які прыклад можаце прывесці?

— Прыкладаў пакуль няшмат, мы толькі пачалі. Прадпрыемствы Гомельскай вобласці пастаўляюць у Францыю звычайныя асінавыя калкі для вінаграднікаў. Іх кошт даволі высокі. Сёння ў Жодзіне мы паглядзелі на цудоўныя драўляныя скульптуры, якія створаны мясцовым работнікамі. Нават на вырабе такой, невысокай па кошце адзінкавай прадукцыі, можна дадаткова зарабіць валюту.

— Вы казалі аб прадпрымальніцкім духу...

— Калі падраздзяленне мае вытворчасць і ўласнае абсталяванне, нават і не самае сучаснае, то праз некаторы час, я лічу, яно можа выйсці на экспартную магутнасць. Мы бачым па рабоце гандлюючых структур, што прадукцыя наша можа быць ліквідная і запатрабаваная ў краінах Еўропы. Трэба не толькі, як і дваццаць гадоў таму, вырабляць тыя ж самыя вокны, дзверы для ўнутраных патрэбаў, але і рухацца наперад. Зайдзіце на будаўнічы рынак і паглядзіце, колькі каштуе гэтая ж самая прадукцыя ў прыватных прадпрымальнікаў. Мы таксама прадпрымальнікі, толькі дзяржаўныя, наша задача — прадаць і атрымаць прыбытак, і адпаведны дух павінен прысутнічаць.

Дадаткова сродкі камунальнікаў зберагаюцца зараз і на іншых відах дзейнасці. Напрыклад, у Жодзіне пракладка толькі аднаго, працягласцю ў 300 метраў, участка цеплатрасы папярэдне ізаляванымі трубамі эканоміць да 10 тон умоўнага паліва. А калі яшчэ, як запатрабаваў Уладзімір Белахвостаў, усе камплектуючыя для гэтых трубаў будуць таксама беларускай вытворчасці, то зберагчы энергію, адпаведна, і фінансавыя сродкі, можна будзе яшчэ лепш:

— Папярэдне ізаляваныя трубы (пі-трубы) маюць тэрмін службы 50 гадоў. Пры іх пракладцы асноўнае патрабаванне — якасць выканання работ, каб не давялося рабіць рамонт раней за час іх зносу. Таму першасным павінен стаць не тэрмін здачы аб'екта, а адсутнасць браку ў рабоце. Ніхто не будзе памятаць, што цеплатрасу пераклалі ў рэкордна кароткія шэсць дзён, калі на ёй потым здарыцца аварыя. Затое ўсе будуць ведаць, што труба бездакорна адслужыла пяцьдзесят гадоў, — працягвае міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі. — А беларускія заводы павінны асвойваць вытворчасць не толькі труб, але і ўсяго неабходнага для іх пракладкі.

Імпартная тэрмаўкладачная муфта для пі-трубы ў Даніі каштуе 5—7 долараў, а беларуская камунальная гаспадарка набывае яе ўжо за 15—18 долараў. Таму ў Мінскай вобласці, на базе завода па вытворчасці папярэдне ізаляваных труб пачнецца і вытворчасць танных камплектуючых.

— За гэты год на Міншчыне на пі-трубы заменена ўжо больш за 80 працэнтаў запланаванай колькасці цеплатрасаў. Акрамя таго, згодна з заданнем, сёлета будзе ўсталявана 126 крыніц цяпла, якія працуюць на мясцовых відах паліва, — кажа генеральны дырэктар Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі» Аляксандр Жураўскі. — Зараз ідзе актыўная нарыхтоўка дроў і дранкі. Да канца года ўсімі неабходнымі аб'ёмамі МВП вобласць будзе забяспечана.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Свая справа

Фота Мікалая БЯЛЬКОВІЧА.

КАВАЛЬ з мастацкім ухілам

З Віталем Васільевічам Галаўцовым я пазнаёміўся ў Рэчыцы, дзе праходзіў рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2007». У «горадзе майстроў» на вачах у людзей ён каваў элементы для каміннага набору. І з-пад яго рук яны выходзілі лёгкімі, ажурнымі. Нельга было не залюбавацца і кветнікамі ў выглядзе кенгуру, асла з арбой, вярблюда з барадой, іншымі вырабамі яго прыватнай фірмы «Мастацкая коўка».

Аб тым, што ён стане прадпрымальнікам і будзе мець сваю справу, Віталь Галаўцоў ніколі нават не задумваўся. Ні ў дзяцінстве, калі іхняя сям'я жыла ў Саратаўскай вобласці, ні ў юнацтве, калі яны пераехалі ў Валгаградскую ў горад Камышын. Па-першае, не тыя часы тады былі, каб думаць аб прыватным капітале, а па-другое, ён меў мару атрымаць добрую прафесію. Скажам, вайскоўца-афіцэра.

Недасягальнай яе ён не лічыў, аднак веды яму давялося здабываць у вячэрняй школе па сямейных абставінах: патрэбна было зарабляць на хлеб, дапамагаць бацькам. Таму з шаснаццаці гадоў працаваў вучнем токара, неўзабаве атрымаў чацвёрты разрад. Далейшыя яго жыццёвыя ўніверсітэты былі звязаныя з прафтэхвучылішчам сувязі, якое закончыў з адзнакай, і на гарызонце «засвяціла» запаветнай зоркай Камышынскае вышэйшае інжынерна-камандное вучылішча. Служба яго праходзіла ў закрытым гарадку ў Паўночным Казахстане ў ракетнай дывізіі на пасадзе начальніка радыёмайстэрні па рамонце сувязі. Там жа яна і закончылася з-за стану здароўя. Віталю тады было ўсяго (а можа, ужо) трыццаць гадоў. І сям'я: жонка Людміла Уладзіміраўна, якая дзяўчынай прыязджала ў той закрыты гарадок у госці да сваёй сястры, і маленькая дачка Юля.

Галаўцоў стаяў перад выбарам: у тым жа годзе атрымаць кватэру ад Узброеных Сілаў Савецкага Саюза або праз тры гады — на радзіме жонкі ў Гомелі. Пабываўшы ў горадзе на Сожы, ён вырашыў — толькі Беларусь. Так і апынулася яго сям'я тут у малагабарытнай кватэры цешчы.

Магчыма, так бы ён і зараз працаваў на дзяржаўных службах (а за той час Віталь Васільевіч быў і тэлевізійным майстрам, і галоўным інжынерам універмага «Гомель», і галоўным інжынерам філіяла «Белатракцыён»), калі б ён не наведаў Венгрыю і не пазнаёміўся з бізнэсам. Той заключаўся на тым этапе ў самым простым: закупляць аўдыё і відэаапаратуру і іншы тавар у Аўстрыі і прадаваць яго ў Венгрыі і Югаславіі. І гэтак — два месяцы. Такім чынам, з'яўляліся грошы. Прыток іх яшчэ больш павялічыўся, калі яму давялося ўдзельнічаць у будаўніцтве сінагогі ў Ізраілі, дзе за адну гадзіну працы плацілі ў эквіваленце тры долары, і калі ён пачаў ганяць на продаж легкавушкі з Германіі, Італіі, Аўстрыі і Венгрыі. Такое ў той час, калі адбыўся развал адзінай краіны, дазвалялася нашым грамадзянам, і многія з іх набылі першапачатковы капітал для адкрыцця сваёй справы. У іх ліку быў і Віталь Галаўцоў.

Тут трэба сказаць, што ён — чалавек з залатымі рукамі, памяркоўны, удумлівы, з творчай жылкай, працалюбівы, лёгкі на пад'ём. Вырашыўшы займець катэдж, атрымаў дазвол на яго будаўніцтва і сам спраектаваў усё да драбніц. Больш за тое, і ўзводзіў яго пяць гадоў разам са сваім таварышам. Сам клаў цэглу, майстраваў рамы, дзверы, кухонную мэблю, выконваў усе іншыя работы. І дом атрымаўся на славу. Віталь Васільевіч правёў мяне па ім. Усё тут даведзена да ладу, на ўсіх двухстах квадратных метрах плошчы. У падвальным памяшканні — саўна з басейнам. Па перыметры альтанкі — пограб. Далей — гараж, пад ім — рамонтная майстэрня аўтамабіляў. Прасторная зала, спальныя пакоі, ванная і г.д. У катэджы няма газу, і ён абагравацца ад каміна і радыятараў, якія Галаўцоў знайшоў на дне возера, куды нехта іх выкінуў з-за непатрэбы. З іх ён і вырабіў абагравальнік, удасканаліўшы так, што той мае велізарны каэфіцыент карыснага дзеяння.

Увесь падворак — гэта дванаццаць сотак зямлі разам з катэджам. Невялікі садок, кветкі. У другім канцы агарода — так званая вытворчая зона.

— Калі стала нявыгадна ганяць аўтамабілі з-за мяжы, — расказвае Галаўцоў, — паўстала пытанне: чым заняцца, каб прымножыць свой бізнэс і прыносіць карысць іншым. Падумаў-памеркаваў і прыйшоў да высновы: для мяне этап «купі—прадай» ужо ззаду. На парадак дня павінна выходзіць вытворчасць. Але — якая? Відавочна, усё ж мастацкая коўка, рэдкі занятак — промысел, які даецца не кожнаму. Я ж у кавальстве меў нейкія навыкі з дзяцінства, не-не ды і дапамагаў свайму дзядулюкавалю. А тут — мастацкая коўка, найбольш складаная. Ды нічога, думаю, у каго адвага, у таго й перавага. Таму засеў за падручнікі, каб адолець навуку. На гэта спатрэбілася два гады.

У Галаўцова ўсё атрымалася. Атрымаў ліцэнзію прадпрымальніка і добра памятае свой першы заказ — тры каваныя балконныя агароджы па шэсць метраў кожная з каванымі матылькамі для катэджа ў прыгарадзе Гомеля. Працаваў над імі, як кажуць, да сёмага поту і атрымаў падзяку заказчыка. А потым пайшло-паехала.

Працаваць з металам — няпроста. Трэба валодаць не толькі інжынернымі ведамі і пэўнай тэхналогіяй металаапрацоўкі, але і чуццём, мастацкім густам, мастацкай думкай. Амаль усё абсталяванне зроблена рукамі самога прадпрымальніка або ўдасканалена ім, акрамя свідравальнага станочка і кавадла. Вось станок для халоднай фігурнай гібкі металу з сячэннем да дваццаці міліметраў. Схему яго ён знайшоў у Інтэрнэце, і станок з'яўляецца ўніверсальным, працуе на розных хуткасцях. Калі купіць яго, то затраціш паўтары тысячы еўра. Віталь жа Васільевіч вырабіў яго сам. Тое ж самае з паўаўтаматам і аўтаматам зваручнымі, горнам, у якім выкарыстоўваецца рухавік ад пральнай машыны. Тут жа маятнікавы станок для рэзкі металу. Таксама самаробны. А вось такарны, які быў непрыгодны для работы. Галаўцоў даў яму другое жыццё.

За майстэрняй — горы металу рознага. І гаспадар тлумачыць, што ён набывае яго для работы, не чакаючы, што цэны могуць падымацца. На пытанне, ці многа заказаў паступае ў яго фірму, ён адказвае, што прадукцыя яе — самая разнастайная. Гэта павеці з палікарбаната, поручні з нержавейкі храміраваныя каваныя; вароты, брамкі, агароджы, казыркі, рашоткі, камінныя наборы, лесвіцы вінтавыя, маршавыя і г.д. Да яго паслуг звяртаюцца як арганізацыі, так і фізічныя асобы, і ўсе заказы ён выконвае з высокай якасцю і своечасова. Згодна з новым заканадаўствам яго фірма можа развалiцца, бо з 2008 года дазваляецца справу весці ў падобных яму выпадках толькі яго родзічам. Жонка і дачка мастацкай коўкай займацца не будуць, зяць — таксама, таму што ў яго свая справа. На ўсякі выпадак Віталь Васільевіч узводзіць два аб'екты на сваім агародным участку. Адзін з іх — невялікі кіёск, дзе ён мае намер прадаваць вырабы мастацкай коўкі. Другі — драўляны будынак памерам восем на восем метраў. Што будзе там, яшчэ не вырашыў. Але добра вядома: калі нешта будуецца, то жыццё працягваецца...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Вызначаны прэтэндэнты на атрыманне прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці ў 2007 годзе

Закончыўся прыём заявак і дакументаў на ўдзел у дзевятым конкурсе на атрыманне Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці.

Паводле інфармацыі сакратарыята камісіі па прысуджэнні Прэміі пры Дзяржстандарце Рэспублікі Беларусь, у 2007 годзе на званне лаўрэата прэтэндуюць 62 прадпрыемствы розных галін прамысловасці ў сферы паслуг. Сярод іх:

УП «Інстытут Гроднаграмадзянпраект»;
ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі»;
ААТ «Смаргоньсілікатабетон»;
ДП «Мінойтаўскі рамонтны завод»;
РУП «Мінск Крышталь»;
ААТ «Акцябрскі завод сухога абястлушчанага малака»;
Мінская цэнтральная мытня;
ААТ «Лесахімік»;
ААТ «Шклоўскі масларобны завод»;
СТАА «Бел-Пласт Інтэрнэшнл»;
СЗАТ «Коханаўскі трубны завод «Белтрубпласт»;
ААТ «Лідахлебапрадукт»;
РУП «Гомельскі завод «Камунальнік»;
РУВП «Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік»;
УП «Барысаўскі камбінат хлебапрадуктаў» ААТ «Мінскаблхлебапрадукт»;
ААТ «Беларускія шпалеры»;
ААТ «Глыбоцкі мясакамбінат»;
ААТ «АФВК «Жлобінскі мясакамбінат»;
ТАА «БелКультПраект»;
УП «Брэстаблгаз»;
ААТ «Мінскі завод будаўнічых матэрыялаў»;
ААТ «Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат»;
Філіял Завод жалезабетонных маставых канструкцый РУП «Дарбудіндустрыя»;
САТ «Марко»;
РУП Сетлагорскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання «Светлагорскхарммаш»;
ААТ «Пінскі малочны камбінат»;
ЗАТ «Навукова-вытворчая арганізацыя «ЭЛЬВІРА»;
ПУП «Гомельтурыст»;
ААТ «Гродзенскі механічны завод».

У тым ліку званне лаўрэатаў трэба будзе пацвердзіць прадпрыемствам, што сталі пераможцамі конкурсаў, якія праводзіліся ў 2001 і 2004 гадах:

СП «Фрэбор» ТАА;
ААТ «Харчтавары»;
УП «Мінскі электратэхнічны завод імя В.І. Казлова»;
ААТ «Світанак»;
РУП «Беларускі металургічны завод»;
ААТ «Галантэя»;
СП «Санта Брэмар» ТАА;
ПУП «Святлопрыбор» ГА «БелТІЗ»;
ААТ «Мазырсоль»;
ААТ «Цэнтраэнергамантаж»;
ААТ «Элема»;
ААТ «Бабруйскаграмаш»;
Філіял РУП «МАЗ» «АМАЗ»;
РУП «Гомсельмаш»;
ААТ «Савушкін прадукт»;
СП ААТ «Спартак»;
ААТ «Белэнергарамналадка»;
РУП завод «Магілёўліфтмаш»;
ААТ «Салігорскпрамбуд»;
РУВП «558-ы Авіяцыйны рамонтны завод»;
ААТ «Баранавічхлебапрадукт»;
ААТ «Амкадор»;
ААТ «Магілёўскі металургічны завод»;
Установа «Ліцэй БДУ»;
СП «БЕЛІТА» ТАА;
РУВТП «Аршанскі льнокамбінат»;
ЗАТ «Пінскдрэў»;
ВРУП «Крычаўцэментнашыфер»;
ААТ «Слоніммэбля»;
ААТ «Камунарка»;
РУП «Атэль «Мінск»;
ААТ «ПІНЕМА»;
ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат».

У цяперашні час на прадпрыемствах-прэтэндэнтах пачынаюць працаваць экспертныя групы, якія ацэньваюць стан работ па якасці ў адпаведнасці з устаноўленымі крытэрыямі мадэлі Прэміі. Пры правядзенні экспертызы на месцах асаблівая ўвага надаецца выпуску новых відаў прадукцыі, укараненню прагрэсіўных тэхналогій, у тым ліку энерга- і рэсурсазберагальных, пашырэнню экспартных магчымасцяў, укараненню сістэм кіравання якасцю на падставе міжнародных стандартаў пры вытворчасці прадукцыі і аказанні паслуг.

Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў час Рэспубліканскай канферэнцыі «Якасць-2007», якая адбудзецца ў Мінску ў канцы года. Лаўрэатам будуць уручаны дыпломы і сімвалы Прэміі, а таксама дадзена права выкарыстання ў маркіроўцы прадукцыі, дакументацыі і ў рэкламных матэрыялах выявы эмблемы Прэміі. Акрамя гэтага, спіс пераможцаў будзе размешчаны на Інтэрнэт-сайце Дзяржстандарта Рэспублікі Беларусь (www.gosstandart.gov.by), апублікаваны ў аглядзе нацыянальных прэмій у галіне якасці часопіса «Еўрапейская якасць» і ў навукова-практычным часопісе «Стандартызацыя», а таксама ўключаны ў ілюстраваны каталог лаўрэатаў конкурсу, які выдаецца штогод. Каталог будзе перададзены ў прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь за мяжой.

Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь.

Небяспечныя нататкі

ЗА ЯГАДАМІ ЎБАЧЫЦЬ І БАЛОТА

Пра ягады многа пішацца, бо з прыходам восені для палешукоў гэта ўжо нават не «другі хлеб», а першы. Хоць гэта датычыцца не толькі журавінаў, а і іншых дзікіх ягад. Яны карыстаюцца попытам і ў іх нарыхтоўку ўцягнуты вялікі працэнт насельніцтва, дзейнічае сістэма закупак. І ўсё было б добра, калі б не грубыя парушэнні заканадаўства.

Сваім рашэннем райвыканкамы даюць дазвол і ўстанаўліваюць квоту на збор ягады юрыдычным асобам. І ў адпаведнасці з дзеючымі нормамі ім неабходна плаціць падаткі. Але кожны прадпрымальнік хоча закупіць ягад як мага больш, а падаткаў заплаціць найменш.

Ганцавіцкі райвыканкам на сваім пазачарговым пасяджэнні пазбавіў сялянска-фермерскую гаспадарку «Ширп-Торг» права займацца нарыхтоўкай журавінаў. Праверкі паказвалі, што фермер Ю. Пішч парушае правілы закупкі ягады. Напрыклад, адсутнічалі журналы рэгістрацыі ведамасцяў, а самі ведамасці не запаўняліся. Колькі нарыхтавана (закуплена) ягады, невядома — дзесяць тон ці ўсе сто. Раскінуўшы па ўсім раёне сетку нарыхтоўчых пунктаў, фермер, фактычна выйшаў з-пад кантролю і атрымаў шырокае поле для сваёй дзейнасці. Яго на першы раз папярэдзілі, але калі пасля гэтага праверылі нарыхтоўчы пункт у в. Любашава, зноў выявілі парушэнні.

І тут цікавы момант. Сёлета падаткі ад збору журавінаў паступаюць у бюджэт сельскіх Саветаў на тэрыторыі якіх вядзецца нарыхтоўка ягад. Дык вось, нарыхтоўчы пункт у в. Любашава знаходзіцца побач з сельскім Саветам, і гэты факт, відавочна, павінен быў бы паўплываць на сітуацыю. Мы многа пішам, якія ў нас актыўныя мясцовыя дэпутаты, старасты, а ўжо пра кіраўнікоў сельскіх Саветаў і гаворкі няма, то чаму б камусьці з мясцовага Савета не зазірнуць на пункт закупкі і пацікавіцца, ці ўсё там у парадку? Ніхто не можа ведаць лепш сітуацыю на сваёй тэрыторыі, чым работнікі сельсавета, і калі там плачуцца, што няма грошай, то здараецца, што грошы трэба толькі падняць — няхай сабе і не вялікія.

Бывае, нарыхтоўшчыкі ўстанаўліваюць для насельніцтва (здатчыкаў) заведама заніжаную цану на ягаду і пры гэтым ківаюць на раённую ўладу. Маўляў, я хацеў бы заплаціць вам і болей, ды толькі не магу, бо райвыканкам менавіта такую цану ўстанавіў. Хоць кошт на ягаду ўстанаўліваюць нарыхтоўшчыкі, і ён дагаворны.

Акрамя гэтага, часта закупка журавінаў вядзецца не на нарыхтоўчых пунктах, а дзе давядзецца: у лесе, пры дарозе, каля вёскі ці тайна ў чыёйсьці хаце. А тут ужо нясе адміністрацыйную адказнасць не толькі нарыхтоўшчык, але і здатчык ягад. Усё гэта робіцца каб пазбегнуць кантролю і падаткаў. І неабходна прызнаць, што схапіць некага за руку ўдаецца рэдка, а галоўнае, што ахвотных зрабіць гэта асабліва і няма.

З прадпрымальнікамі ўсё зразумела — кожны дбае толькі пра сваю выгаду. Але і тыя, хто ідзе на балота, павінны, на маю думку, браць дазвол. І тут таксама неабходна сістэма. Напрыклад, чалавек мае права ў дзень сабраць 30 кг журавінаў і для гэтага яму патрэбна ўзяць дазвол на гэты дзень і заплаціць, скажам, 5 тысяч — цану аднаго кілаграма журавінаў. Узнос сімвалічны, але за дзесяць дзён набяжыць ужо 50 тысяч.

— Спрадвеку ніхто ў нас на збор ягад не браў дазвол, ды яшчэ паспрабуй тыя журавіны выцягнуць з балота, — скажа нехта.

Сапраўды, нялёгкая работа вынесці журавіны за некалькі кіламетраў па балоце. Але ў якія часы гэтую ягаду можна было прадаць па такой цане? І журавіны сёння даюць добры прыбытак. Кожная сям'я імкнецца максімальна выкарыстаць сезон збору ягад.

Да жыхаркі з в. Боркі, што на Ганцаўшчыне, залезлі зладзеі і выкралі 15 мяхоў журавінаў. Сумны выпадак, але ён сведчыць, што на Палессі збіраць ягады ўмеюць, дарэчы, як і красці.

Калі збор ягад ужо не ўцеха для душы, а папаўненне сямейнага бюджэту, то павінны быць прагледжаны і правілы, па якіх той збор вядзецца.

Калі чалавек прыходзіць нешта прадаць на рынку, то абавязаны аплаціць месца і тут ніхто не пратэстуе. У параўнанні з паляўнічымі і рыбаловамі ў зборшчыка журавінаў відавочная перавага — ён з пустымі рукамі дамоў не вернецца, пры гэтым не заплаціўшы ні рубля.

Нельга браць ад прыроды па максімуму, а нічога ёй не аддаваць. І не будзем празмерна шкадаваць зборшчыкаў ягад, бо нягледзячы на ўсе просьбы, тлумачэнні і забароны, многія з іх збіраюць журавіны варварскім спосабам — скрабкамі. Ягаднікам наносіцца шкода, але зборшчык, як і той закупшчык, думае толькі пра сваю выгаду.

Журавіны збірае не толькі мясцовае насельніцтва. У ягады едуць з гарадоў на дызелі, а пры балотах стаяць аўтамашыны з іншых раёнаў. І ягадамі запасаюцца не абавязкова для сябе, але і на продаж.

А наводзіць парадак у сістэме нарыхтоўкі ягад і трымаць пад кантролем сітуацыю ёсць каму — гэта сельскія Саветы, раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, аддзел ўнутраных спраў, падатковая інспекцыя...

Думаю, неабходна перагледзець усю сістэму нарыхтовак дзікіх ягад. А што датычыцца кантролю, то ён патрэбен найперш не для таго, каб пакараць чалавека, а прывучыць яго глядзець шырэй — бачыць не толькі журавіны, але і балота, на якім яны растуць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Аднаўленне радаслоўнай лепш даверыць прафесіяналам

Сёння на захоўванні ў Нацыянальным гістарычным архіве знаходзіцца больш за мільён рознага роду дакументаў, датаваных XIV — пачаткам XX стагоддзяў: гэта не толькі найважнейшыя дзяржаўныя і судовыя дакументы Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай Імперыі, але і кнігі запісаў купчых на сялян, нерухомую маёмасць, духоўныя завяшчанні, дагаворы, даверанасці, пазыковыя абавязацельствы самых звычайных людзей. І менавіта ў Нацыянальны гістарычны архіў звяртаюцца беларусы за аднаўленнем сваёй генеалагічнай спадчыны, праўда, выкананне генеалагічных запытаў з'яўляецца платнай паслугай.

Паводле слоў дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Алы Галубовіч, пры афармленні заказа на складанне радаслоўнай перадаплата складае для беларускіх грамадзян 230 тысяч беларускіх рублёў. А канчатковы кошт можа дасягаць 1 мільёна рублёў і залежыць напрамую ад паўнаты прадастаўленай кліенту інфармацыі і аб'ёму здзейсненых даследчых работ. Дарэчы, чарга на складанне генеалагічнага дрэва зараз — паўгода.

Між іншым, у беларусаў ёсць таксама магчымасць самастойна працаваць у архівах над складаннем генеалагічнага дрэва, аднак спецыялісты раяць даверыцца ў гэтай справе прафесіяналам, бо нават вяні не заўсёды могуць выканаць пастаўленую задачу па розных прычынах. Бывае, што кліенты зусім мала ведаюць аб сваіх сваяках, ці патрэбная інфармацыя згубілася з-за шматлікіх войнаў. Але прыкладна ў 70 працэнтаў зваротаў архівістам усё ж такі ўдаецца задаволіць інтарэс беларусаў да сваіх продкаў. У пачатку 90-х гадоў сваімі каранямі цікавілася пераважна беларусы, якія пражывалі за мяжой, але ў апошнія гады павышаная цікаўнасць да аднаўлення сваёй радаслоўнай абудзілася і ў жыхароў сучаснай Беларусі...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Добры дзень, родныя словы!

НЕ ЗАПЛЮШЧВАЙМА ВАЧЭЙ...

Атрымаў ліст ад свайго даўняга гомельскага знаёмага. Падтрымліваючы абмеркаванне слоў **сябар** і **член** у дачыненні да арганізацыі, таварыства, ён таксама стаіць за вольнае іх ужыванне цяпер. Час пакажа, якое з гэтых слоў пераможа.

Прачытаўшы ў маім матэрыяле спасылку на яшчэ дакастрычніцкую гісторыю такога ўжывання слова сябар, ён адзначае ў сваім лісце такія ўжыванні ў вядомай аповесці «Ні госць ні гаспадар» нашага таленавітага празаіка Лукаша Калюгі (твор напісаны ў 1928 годзе). Там не аднаго разу сустракаецца **сябар (сябра) бюро** камсамольскай ячэйкі. А на 191-й старонцы. Лукашовых «Твораў» (Мн., «Мастацкая літаратура», 1992) адзін з герояў, намацаўшы ў начной цемені камсамольскі білет, запаліў урэшце запалку. «Пасвяціў. Прачытаў.

— Сяброўскі білет».

Як бачым, усё гэта — і сябар і сяброўскі білет — ужо былі.

І далей мой знаёмец піша: «Як часта ў друку да недарэчнага збядняецца наша мова. На ўзор суседняй безаблічна, абагулена для нашай мовы ўжываецца слова **закрыць**. Закрываюць і дзверы, і вочы, і кнігі. Але што добра ў адной мове, не заўсёды добра ў другой».

І якраз нядаўна трапіўся мне артыкул польскага моваznаўца. Там абмяркоўваўся філасофскі выраз, які не цалкам пакрываў нямецкі. «У гэтым якраз усё шчасце, — пісаў моваznавец. — Калі б польская мова ва ўсім дакладна адпавядала нямецкай, тады б яна перастала быць польскаю. Чым пэўная мова больш самабытная, тым больш у ёй адлюстроўваецца своеасаблівасць культуры, тым яна мацней рознiцца ад іншых моваў абоягам слоўных уяўленняў і фразеалогій. Французам і англічанам не перашкаджае як найплённей займацца філасофіяй той відавочны факт, што іх філасофская тэрміналогія надзвычай рознiцца ад нямецкай. Яны ані не бядуюць і не стараюцца пазбыцца розніц, бо працуюць у глыбокім перакананні аб высокай вартасці ўласнай духоўнай культуры. Тое самае не абыходзіць немцам у адносінах да тых жа народаў».

Вядома, любы навуковы тэрмін дакладна перакладзецца, але сродкамі сваёй мовы. Важна не звужаць, а карыстацца ўсёю шырынёю тых дакладных значэнняў, якія ў яе ўжо ёсць.

У нашай мове **адчыняюцца** і **зачыняюцца** акно, фортка, дзверы, вароты, весніцы, куфар, скрыня, дзежка і нават рот. Ці не чулі: «От, балабон: у яго рот не зачыняецца». І нават прыпеўка-дрындушка — таму сведчанне:

— Што наш мілы Петручок
Гэтак выскаляецца?
— Зубы новыя ўставіў,
рот не зачыняецца.

Вочы ў нас **заплюшчваюць** і **расплюшчваюць**. А **закрываць** вочы — гэта значыць засланяць іх нечым (рукою, далонню і н.д.). І, вядома, закрываюць вочы нябожчыку.

Здаўна бытуюць у нас і фразеалагізмы: **заплюшчваць вочы** *на што* — знарок не заўважаць чаго-небудзь значнага, важнага; зрабіць нешта **заплюшчыўшы вочы** — г.зн. без усялякіх ваганняў, не раздумваючы.

Скажаш ці пачуеш **разгарнуць** ці **загарнуць** і адразу ж побач так і стаяць у чарзе словы: кнігу, сшытак, часопіс, брашуру, газету, том, выданне і г.д.

А скажаш *парасон*, тут жа яны напашэве: **разгарнуць, згарнуць, скласці.**

Фіранкі — **захінуць, адхінуць, завесіць, адвесіць.**

Кран — **адкруціць, закруціць.** А калі ён іншай формы — **націснуць, адпусціць.**

Бутэльку — **адаткнуць, адкаркаваць.** Гэтак жа — **закаркаваць, заткнуць.**

Таксама і пра чалавека, які не дае каму гаварыць, скажуць: хоча (каму) **заткнуць рот.**

Хіба можна замяніць такое багацце слоў якім-небудзь адным **закрыць** (адкрыць)?

Слухаючы на вакзалах: «Цягнік прыбывае... адпраўляецца...», «Самалёт прыбывае... адпраўляецца...», міжволі думаеш: «Чаму трэба выцягваць словы, якія, вядома, ёсць у нашай мове, але туляцца дзесьці на ўзбочыны, а не ўжываць тыя, што самі просяцца: самалёт прылятае... самалёт адлятае...

Але тут — скуль ні вазьміся — выскачыў нячысцік і перапытаў: «Чаму **адпраўляецца**? А таму, што ёсць фразеалагізм «адпраўляцца на той свет».

Фу ты, нячысцікаў гумар!..

Я люблю родную мову, настоеную ў духмені канкрэтных прадметаў, дзе дзеясловы пахнуць назоўнікамі, нясуць памяць прылеглых да іх рэчаў...

Дык карыстаймася! Не забывайма!

Рубрыку вядзе Анатоль КЛЫШКА.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

СПРЭЧКІ ВАКОЛ ДЫВІДЭНДАЎ АД «ЧУЖОГА ПРЫБЫТКУ, ЯКІ ФАКТЫЧНА ЗВАЛІЎСЯ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ З НЕБА»

З вёскі Дрыла-2 Лагойскага раёна ў рэдакцыю са скаргай звярнуўся пенсіянер Аляксандр Міхайлавіч Мірончык. Прычым, як ён сам падкрэсліваў, не толькі ад сябе асабіста, але і ад імя яшчэ каля 30 чалавек, якія трапілі ў аднолькавую сітуацыю. Датычылася яна выплаты дывідэндаў мясцовай гаспадаркай, у якой заяўнік адпрацаваў з 1965 па 2000 год, і якая на працягу апошніх гадоў неаднойчы рэарганізоўвалася, пакуль у выніку не стала сельскагаспадарчым філіялам «Спадарожнік» ААТ «Белсувязьбуд». Аляксандр Міхайлавіч крыху блытана выклаў сітуацыю, зазначыўшы, у прыватнасці, што мае 1050 акцый гэтага акцыянернага таварыства (хоць на пытанне адносна дакументальнага пацвярджэння адказаць не здолеў), але дывідэнды па іх, як некаторыя іншыя яго былыя калегі, не атрымлівае.

Забягаючы наперад, зазначым, што сітуацыя і сапраўды аказалася ў нечым даволі блытанай — якраз «дзякуючы» тым самым шматлікім пераўтварэнням, якія гаспадарцы давялося перажыць за апошнія гады. Гэта нам, у прыватнасці, пацвердзіла галоўны эканаміст сельскагаспадарчага філіяла «Спадарожнік» ААТ «Белсувязьбуд» Таісія Мігунька.

— У 2002 годзе калгас «Спадарожнік» быў неафіцыйна далучаны да суседняй птушкафабрыкі «Перамога». Пасля гэтага адбылося масавае звальненне работнікаў, у калгасе адсутнічаў які-небудзь улік, у тым ліку і кадравы. Увесну 2003 года гаспадарка была адлучана ад птушкафабрыкі, г.зн. аднаўляўся калгас. Многія работнікі пачалі вяртацца ў родную гаспадарку, вялося аднаўленне дакументацыі. У гэты ж час пачалася новая рэарганізацыя. Цяпер ужо калгас пераўтвараўся ў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў (СВК). Я прыйшла на працу ў чэрвені 2003 года разам з новым «кадравіком». Мы пачалі займацца складаннем спіса, у які ўключаліся ўсе работнікі на 26.06.2003 г., і пенсіянеры, якія пайшлі на пенсію пасля 15.03.1991 г. (з дня ўтварэння калгаса). Даныя спісы з'яўляліся абавязковым дадаткам да Статута СВК. Дакументаў фактычна ніякіх не захавалася, а трэба было скласці спісы работнікаў, нагадаю, на 1991 год. Дзе мы толькі ні збіралі гэтыя звесткі: і на пошту хадзілі, і ў сельскі Савет звярталіся, і аб'яву ў магазіне вывешвалі, маўляў, адгукніцеся, людзі. Спісы былі складзены, хоць мы разумелі, што хтосьці ў іх па розных прычынах мог і не трапіць, — прыгадвае Таісія Сяргееўна. — Ад наяўнасці паю людзі ніякіх матэрыяльных выгод не мелі, таму, магчыма, так легкадумна і паставіліся да ўключэння ў спіс.

Далейшыя падзеі разгортваліся наступным чынам. Статут (разам са спісам членаў СВК «Убал

Дзённік бландзінкі

БЕЗ ІЛЬГОТНАГА ТАРЫФУ

Васіль Сёмуха, слынны «перастваральнік» замежнай літаратуры, пераслаў мне свой пераклад «Фердыдуркі» — культавага рамана В. Гамбровіча пра школу і захаванне «самасці».

Спадзяюся, што гэты бліскуча перакладзены тэкст хутка будзе апублікаваны, і будзе нагода напісаць пра яго колькі слоў...

Але цяпер пра іншае. З каментараў да рамана даведалася, што адзін з буйнейшых польскіх крытыкаў — Артур Зандаўэр — паўстагоддзя таму стаў аўтарам гучнай кампаніі з актуальнай для сённяшняй беларускай літаратурнай крытыкі назвай «БЕЗ ІЛЬГОТНАГА ТАРЫФУ».

З задавальненнем распачала б такую кампанію... «Камплімэнтарнасць» сённяшняга крытычнага слова даўно ўжо абурае шэраговага чытача, які чакае хоць бы мінімальнай аб'ектыўнасці... Але, думаю, нават калі ўсе крытыкі шчыра і сумленна стануць гаварыць пра рэальны стан рэчаў, вынікі будуць мізэрныя — пакуль пісьменнікі нашы шукаюць у літаратуры самарэалізацыі, а не сродку існавання, ніякі зменаў у ёй не будзе.

ІСК ДА КАЛАБКА

Некалькі гадоў таму я са здзіўленнем даведалася, што любы таўстуненажэра мог учыніць судовы іск кампаніі Макдоналдс, абвінаваціўшы ў тым, што менавіта з-за яе гамбургераў ён не бачыць уласны пуп.

Нядаўна цётка з Расіі, якая выдувала па тры-чатыры кока-колы ў дзень, падала ў суд і, здаецца, выйграла грашовую кампенсацыю з-за пагаршэння свайго здароўя, якое быццам бы наступіла з-за таго, што на бутэльцы не напісана, што тры-чатыры — то «забардзо».

Вось я цяпер думаю — а ці не падаць мне ў суд на Аляксандра Геніса, крытыка і эсэіста, які ў 2007 годзе выдаў кнігу «Калабок: кулінарныя вандроўкі»?

Справа ў тым, што на кнізе не напісана, што яе чытанне вядзе да павышэння вагі. А між тым гэта чыстая праўда! Кожная спроба занурыцца ў тэкст абарочваецца для мяне тым, што я іду на кухню — а чытаю я, як і ўсе нармальныя людзі, позна вечарам, калі параблю ўсе справы — і пачынаю што-небудзь гатаваць. Эсэ пра грузінскую кухню абарочваецца смажанай з алычой і мёдам баранінай, а пра рускую — салянкай... І вось што цікава — на выгляд кніжка маленькая, покет-бук, а дачытаць да канца яе ніяк не магу! Затое вага мая імкліва расце разам з кулінарным інтэлектам.

Як пазбавіцца ад апетыту, калі чытаеш такое:

«Ну як пра гэта скажаш прозай? Упершыню дарваўшыся да буйабеса ў Ніцы, я ўладкаваў шэсць талерак і да гэтай пары шкадую толькі, што калі мяне выносілі, у карытцы яшчэ плёскалася...»

Аднак не экзатычныя стравы і звычаі насельнікаў другіх краінаў і кантынентаў, любоўна прапісаныя вандроўнікам, з'яўляюцца «соллю» кнігі, а менавіта яе літаратуразнаўчы складнік. Ну дзе, напрыклад, даведаешся, якому меню аддавалі перавагу італьянскія футурысты? А між тым, футурызм быў адзінай мастацкай плынню, якая мела ўласную кулінарную кнігу. Зборнік, выдадзены ў 1932 годзе лідарам італьянскіх футурыстаў Ф. Марынэці, даваў падрабязную справаздачу пра іх шматбаковую гастранамічную дзейнасць. Гэты кулінарны маніфест патрабаваў гарманічнага стала і арыгінальных страваў, прыгатаваных з дапамогай ультрафіялетавых лямпаў, электраліза, аўтаклавання і вакуумных помпаў. Каб звязаць ежу з тактыльнымі адчуваннямі, патрабавалася адмяніць сталовыя прылады, для ўзмацнення водару стравы прапаноўвалася падаваць разам з вентылятарамі. У аддзеле рэцэптаў можна знайсці скульптурнае мяса, аэра-ежу з пахам і гукам, які ішоў ад наждачнай паперы, якая падавалася разам.

Футурыстам належыць ідэя рабіць пейзажы і скульптуры, якія б можна было з'есці. Адна з іх называлася «Экватар і паўночны полюс». Гэту страву гатавалі з яечнага жаўтка, які плаваў пасярод узбітых бялкоў і труфеляў, якія імітавалі аэрапланы палярнікаў. Падобныя мастацка-кулінарныя ідэі прыходзілі ў галаву і беларускім пісьменнікам, напрыклад, членам літаратурнай суполкі «Бум-Бам-Літ», адзін з сяброў якой, Юрась Барысевіч, прапанаваў такі літаратурна-гастранамічны праект: «наляпіць пельменяў у выглядзе розных літараў, выкласці з іх нейкі тэкст, а потым з'есці разам з чытачамі». Як тут не з'іранізаваць — скажы, што ты гатуеш, і я скажу, што ты пішаш...

Авангардызм, як у літаратуры, так і ў кулінарыі, апялюе больш да мозга, чым да страўніка. Таму куды больш цікава чытаць, што любілі класікі. А некаторыя штодзённыя меню (напрыклад, Пушкіна і Гогаля) можна і паўтарыць, дзякуючы падрабязнай рэканструкцыі выбітнага расійскага гісторыка кулінарыі В. Пахлёбкіна. На жаль, няма пакуль такіх рэканструкцый у беларусаў. Затое ўжо ёсць людзі, якія патроху, па частках, узнаўляюць даўнія рэцэпты. Гэта і А. Белы, і А. Антанян, і С. Харэўскі. Я ўпэўнена, яны яшчэ напішуць сваіх «калабкоў», над якімі будзе зглытваць слюну не адно пакаленне маіх суайчыннікаў!

ГЛЯНЕЦ ЯК МІНУЛАЕ

Гламур. Гэтае слова, абцякальнае як гладыш, і ліслівa-пяшчотнае, як муркатанне любімай коткі, цяпер паўсюль. Гламур — галоўны Амур сённяшніх масмедыя, якія даўно ўжо забылі, што абазначае гэтае слова «чараўніцтва», а зусім не «глянец», знешні бляск заможнага жыцця. А між тым яшчэ ў пазамінулым стагоддзі Ч. Дзікенс няшчадна высмеяў сітуацыю, калі людзі, за якімі няма ніякіх дабрадзействаў, акрамя паказушнага шыку, становяцца рупарамі грамадства, як цяперашнія «героі» моладзевых каналаў Звераў і Сабчак. Прозвішча аднаго дыкенсаўскага героя — Венерынг — было ўтворана ад ангельскага «veneer» і азначала якраз «знешні бляск».

Аднак куды больш вядомае імя ў дзядзечкі Скруджа, героя дыснэеўскага мульціка... А між тым вобраз і імя багацея, які збірае багацце дзеля самога багацця, таксама прыдуманы Дыкенсам.

Ганна КІСЛІЦЫНА.

А на мой погляд...

«Пакажыце нам любы фільм, але пра нармальных людзей, пра чалавечыя ўзаемаадносіны»

За апошнія гады кінастудыя «Беларусьфільм» і самастойна і сумесна з расійскімі кінакампаніямі прапанавала гледачам шэраг новых стужак, прычым як для дарослых, так і для дзяцей. Парадавала і разнастайнасць жанраў фільмаў. Прынамсі, калі ўвогуле параўноўваць сітуацыю ў галіне кінавытворчасці, напрыклад, з пачаткам-сярэдзінай 1990-х гадоў, зараз, без перабольшання, можна гаварыць не толькі аб адраджэнні ранейшых слынных традыцый, але і аб новых накірунках, новых здабытках: таленавітых акцёрах, сцэнарыстах, рэжысёрах. Іх праца не толькі на слыху, але і ў прамым сэнсе слоў навідавоку.

А ці любіце асабіста вы кіно? Якім жанрам аддаяце перавагу? Ці часта выпадае магчымасць паглядзець новую кінастужку? Якія работы, знятыя на беларускай кінастудыі (ці з удзелам расійскіх кінакампаній) за апошнія гады вам найбольш запомніліся, спадабаліся? Якіх фільмаў асабіста вам, магчыма, не хапае?

Генадзь ДЗІЧКОЎСКІ, ветэрынарны фельчар СВК «Раманава» Слуцкага раёна:

— Шчыра кажучы, з-за працы асабліва часу глядзець кінафільмы ў мяне няма. Хіба толькі восенню—зімой, калі пачынае рана змяркацца, і ў доме праводзіш больш часу. Ды і тое, бывае, уключыш тэлевізар, а палова фільма прайшла ўжо. А ўвогуле мне падабаюцца стужкі аб прыродзе ці знятыя на прыродзе. А яшчэ з задавальненнем паглядзеў бы які-небудзь новы фільм пра сельскую гаспадарку, вясковых працаўнікоў, прычым гэта магла б быць і мастацкая стужка.

Міхаіл УЛАШЧЫК, старшыня прафсаюза аддзела адукацыі Карэліцкага райвыканкама:

— Безумоўна, люблю глядзець кінафільмы. Магчыма, не кожны дзень, але даволі часта, асабліва, зразумела, па вечарах, у мяне бывае дастаткова часу — 2—2,5 гадзіны — каб пацікавіцца тым, што паказваюць па тэлебачанні. Вельмі люблю і аддаю перавагу гістарычным стужкам. Скажам, вельмі спадабаўся фільм Пташука «У жніўні 44-га». Гэта ж таксама наша гісторыя, хоць і адносна блізкая. А яшчэ хацелася б, каб і мастацкія, і дакументальныя стужкі на гістарычную тэму закраналі і больш раннія часы, напрыклад, перыяд станаўлення беларускай дзяржавы, пачынаючы ад Вялікага княства Літоўскага.

Яўгенія АРАШКЕВІЧ, начальнік ідэалагічнага ўпраўлення Лагойскага райвыканкама:

— Фільмы гляджу вельмі рэдка, паколькі шмат працы. Ды і тэлевізара ў мяне зараз няма *(смяецца)*. Не, не прынцыпова, проста я не так даўно змяніла месца жыхарства, і тут тэлевізар яшчэ не паставілі. З фільмаў, пра якія вы пытаецеся, магу назваць, напрыклад, «У жніўні 44-га» і «У чэрвені 41-га». Бачыла абодва, спадабалася. А ўвогуле я аддаю перавагу фільмам псіхалагічным, драмам, магчыма, дэтэктывам. Яшчэ думаю, што заўсёды запатрабаванымі будуць патрыятычныя стужкі. Калі публіцыстычныя фільмы на гэтую тэму ёсць, дык мастацкіх на тэму менавіта сучаснага патрыятызму вельмі мала. Думаю, яны былі б вельмі карыснымі для ўсяго нашага грамадства, і для моладзі найперш.

Марыета НАВУМЕНКАВА, пенсіянерка, г. Мінск:

— У кінатэатры мы ўжо не ходзім, бо грошай на гэта няма *(смяецца)*. У асноўным аддаём перавагу тэлебачанню. Вельмі любім з мужам ранейшыя савецкія фільмы: і меладрамы, і камедыі. Сучасныя фільмы, скажу вам, глядзець проста немагчыма, бо там практычна адны забойствы ці разбэшчанасць, прастытуцыя. Але ж адным гэтым грамадства не жыве! Дзе звычайныя нармальныя людзі, не алігархі?! Дзе нармальная сям'я на тэлеэкране? Спадабаўся толькі адзін расійскі серыял, дзе здымаліся Бойка і Парошына: пра каханне, асабліва і сэксу з забойствамі не было. Таму сучасныя фільмы гатовыя глядзець любога жанру, на любую тэму, абы толькі там паказваліся звычайныя чалавечыя якасці, нармальныя ўзаемаадносіны ў сям'і, у грамадстве.

Валерый КАШЧАВО, начальнік планавага аддзела «Мінскаблгаза»:

— Тэлевізар гляджу, у тым ліку і мастацкія стужкі, штодня. Асабіста мне больш падабаецца фантастыка, але ні беларускіх, ні расійскіх новых фільмаў на гэтую тэму за сёлетні, прынамсі, год прыгадаць не магу. Былі ўдалыя фільмы пра вайну, асабіста мне спадабаліся два: «Вайна» і «Зорка». Магу паглядзець і камедыю, і баявік. У кінатэатрах з-за занятасці бываю, магчыма, не так і часта, але, думаю, за год атрымліваецца 5—6 паходаў, у тым ліку і на кінапрэм'еры.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ІВАН ЦІХАН СТАЎ ГАНАРОВЫМ ГРАМАДЗЯНІНАМ СЛОНІМА

У мінулую суботу горад Слонім адзначыў 750-годдзе з дня першага ўпамінання горада ў Іпацьеўскім летапісе.

У гэты святочны дзень у Жыровічах адбылася прэзентацыя вераснёўскага нумара часопіса «Маладосць», прысвечанага гісторыі, літаратуры і культуры слонімскай зямлі.

Слонімцы шчыра віталі сваіх знакамітых землякоў — чэмпіёна свету па кіданні молата Івана Ціхана, чэмпіёна Алімпійскіх гульняў у Манрэалі па веславанні Уладзіміра Раманоўскага і лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі скульптара Івана Міско, якія сталі ў гэты дзень ганаровымі грамадзянамі горада над Шчарай.

Сяргей ЧЫГРЫН.

ЛЕПШЫ ФІЛЬМ — ПРА ПАЛЕССКУЮ ВЁСКУ

Шосты рэспубліканскі фестываль беларускіх фільмаў завяршыў сваю работу ў Брэсце.

Гран-пры фестывалю за лепшы фільм, які ўвасабляе нацыянальную тэму, прысуджаны дакументальнай стужцы Галіны Адамовіч «Завядзёнка». Сваё кіно Галіна здымала па ўласнаму сцэнарыю ў вёсцы Старына Столінскага раёна. Гісторыя сям'і Івана і Таццяны Слуцкіх — тыповая для гэтага краю. У іх 12 дзяцей, 7 унукаў, чатыры каровы, свой грузавік і парнік для агуркоў на 17 сотках. Фільм складзены з карцінак вясковага жыцця, праз якія добра бачная любоў і павага аўтара да гэтых простых людзей. За лепшую жаночую ролю адзнаку фестывалю атрымала Юлія Кадушкевіч у фільме «Я помню». Лепшай мужчынскай роляй прызнана работа Генадзя Гарбука ў фільмах «Ворагі», «Я памятаю». Крыштальным буслам адзначана рэжысура дакументальных фільмаў Аляксандра Карпава «Сёння вечарам абыдземся без ахвяраў» і «Пагаворым на ты, або Сеанс скульптурнай лепкі як псіхааналіз...» Лепшым мастацкім фільмам прызнана карціна «Рыфмуецца з любоўю» Аляксандра Яфрэмава, лепшым дакументальным — «Крывая Ніва» Сяргея Рыбакова.

Яна СВЕТАВА.

Старонкі гарадскога жыцця — старонкі альбома

«Сучасны Мінск — гэта горад, дзе квітнеюць «навукі, мастацтвы, рамёствы», дзе «ўзыходзяць» новыя прыгожыя будынкі і «расцвітаюць» старыя, дзе жывуць шчырыя, таленавітыя і працавітыя людзі, дзе пад мірным небам «распускаюцца кветкі казачнага харастваа», — звяртаецца старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Міхаіл Паўлаў да цікаўных асобаў са старонак альбома «Мінск квітнеючы». Прынамсі, такім сталіцу Беларусі бачыць фатограф Пётр Кастрама, аўтар больш за 1000 здымкаў, якія былі зроблены спецыяльна для альбома.



Пётр Кастрама захапляецца Мінскам і даўно, з захапленнем яго здымае. Таму што добра ведае гэты горад і нават сам спрычыніўся да пачатку грандыёзнага будаўніцтва сталічнага метро. А потым з такой жа самаадданасцю стаў фіксаваць на фотакамеру значныя для горада і для краіны падзеі. Летась ён ужо стаў аўтарам аднаго фотаальбома, які быў прысвечаны Мінску. Але да 940-годдзя хацелася зрабіць асаблівы падарунак — больш падрабязны альбом, дзе былі б адлюстраваны самыя розныя праявы гарадскога жыцця: яго мінулае, спадчына і гістарычныя аб'екты, сённяшняя праца найбуйнейшых прадпрыемстваў, яго культурнае аблічча — Нацыянальная бібліятэка, музеі, тэатры і месцы адпачынку.

Знайшліся асобы, якія былі зацікаўлены ў такім альбоме. Грамадскі прэс-цэнтр кантраляваў працэс працы, які доўжыўся паўтара года. Гарвыканкам дапамог тым, што фатограф Кастрама мог здымаць свабодна любыя аб'екты. Безумоўна, у яго былі свае кансультанты па розных тэмах. Некаторыя раздзелы патрабавалі нават выкарыстання здымкаў з архіваў — пра археалагічныя раскопкі, напрыклад, ці значныя тэатральныя прэм'еры. Рэдактар Юлія Бацюлёва пастаралася, каб здымкі «загаварылі» — альбом у выніку можна не толькі паглядзець, але і пачытаць у ім пра тое, што складала і складае славу горада. Слава гэтая зусім не малая — альбом, які выдала «Фабрыка каляровага друку», складаецца з 584 старонак.

— Я пачаў здымаць тое, што сам ведаў і хацеў адлюстраваць, — гаворыць Пётр Кастрама. — Вельмі цікава назіраць за гарадскім жыццём, тым больш калі ты фатограф і павінен злавіць нейкі момант, які больш не паўторыцца. Віды горада здымаў на свой густ, я ведаю, дзе прыгожа, цікава. Калі трэба было, нават лазіў на дахі. Хацелася, каб альбом да 940-годдзя Мінска атрымаўся добры. Як фатограф я не зраблю дрэнны, непрыгожы кадр. Я лічу, што любы чалавек, які сумленна займаецца сваёй працай, павінен рабіць яе добра, каб радаваць людзей.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.25	18.28	11.03
Віцебск —	7.16	18.16	11.00
Магілёў —	7.15	18.18	11.03
Гомель —	7.10	18.16	11.06
Гродна —	7.40	18.43	11.03
Брэст —	7.39	18.45	11.06

Месяц

Маладзік 11 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Івана, Уладзіміра, Ціхана, Яфрэма;*
К. *Анастасіі, Арнольда, Багдана, Вінцэнта, Людвіка, Яна.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+13 — +15 °C	МАСКВА	+5 — +7 °C
ВІЛЬНЮС	+9 — +11 °C	РЫГА	+10 — +12 °C
КІЕЎ	+12 — +14 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+3 — +5 °C

Без ападкаў

9 кастрычніка

Дзве даты

Сёння — Сусветны дзень пошты. Праводзіцца штогод у дзень стварэння ў 1874 годзе Сусветнага паштовага саюза. На тэрыторыі Беларусі рэгулярная паштовая сувязь была арганізавана 340 гадоў таму, у 1667 годзе, калі стаў працаваць рэгулярны паштовы маршрут Масква—Смаленск—Магілёў—Мінск—Вільня. У 1896 годзе ў Мінску была пабудавана першая паштова-тэлеграфная станцыя.

1762 год — мястэчка Мядзел Віленскага ваяводства атрымала магдэбургскае права. Мядзел упершыню згадваецца ў летапісных дакументах у 1454 годзе. Мястэчка ў розныя часы належала Радзівілам, Францкевічам, Райскім, Грабкоўскім, Кошчыцам.

1967 год — у Балівіі забіты лацінаамерканскі рэвалюцыянер Эрнэста Чэ Гевара, прызнаны лідар левага руху ва ўсім свеце.

Цытата дня:

«Вопыт заўсёды бярэ самую высокую плату за навучанне, але і вучыць ён лепш за ўсіх настаўнікаў».
Томас Карлейль (1795—1881), англійскі публіцыст.

УСМІХНЁМСЯ!

Падчас танца кавалер пяшчотна прыціскае да сябе паненку і шэпча:

— Ах, я адчуваю сябе, як у раі!

— Праўда? А я — быццам у аўтобусе...

Учора цэлы дзень хадзіла па кірмашы, хацела купіць сабе штаны. У тыя, якія мне падабаюцца, я не ўлажу, тыя, у якія ўлажу — не падабаюцца.... Давялося набыць сумачку.

Муж вяртаецца з работы, жонка радасна сустракае яго:

— Уяўляеш, у нашага немаўляці з'явіўся першы зубок!

— Цудоўна!

— І ён зрабіў першы крок!

— Выдатна!

— Але, зрабіўшы першы крок, ён згубіў свой першы зуб.

— Вой!

— Аднак, згубіўшы свой першы зуб, наш маленькі сказаў сваё першае слова!

— Цудоўна!

— Але каб ты ведаў, якое!..

Жонка — мужу:

— Я ж табе казала, што ты можаш выпіць не больш за дзве чаркі і вярнуцца дадому не пазней за дзесяць гадзін вечара?

— Значыць, я ўсё перабыстаў.

Вакол спорту

ДВОЙЧЫ МАЦІ ВЫХОДЗІЦЬ НА СТАРТ

У беларускім і ў сусветным біятлоне неверагодны выпадак: пасля нараджэння другога дзіцяці 30-гадовая спартсменка працягвае трэніравацца і збіраецца змагацца за медалі. Маю на ўвазе Вольгу Назараву, якая пасля перапынку вярнулася ў спорт, прычым па выніках тэстаў Вольга — лепшая ў стральбе ў камандзе.

— Першае пытанне напрошваецца само сабой: што ж падштурхнула вярнуцца ў спорт пасля гадавога перапынку?

— Я не была задаволеная вынікамі Алімпійскіх гульняў у Турыне, — тлумачыць Вольга. — Адчувала, што магу змагацца за медаль, але шанцавання не было. Вось я і вярнулася, каб самарэалізавацца, бо столькі сіл і працы ўкладзена ў спорт, што хочацца аддачы. Яшчэ некалькі гадоў папрацую, а ўжо потым можна будзе выхоўваць дзяцей.

— Што даў зразумець першы старт на чэмпіянаце Беларусі па летнім біятлоне: у фізічным ці псіхалагічным плане трэба зараз працаваць над сабой?

— Упэўненасць у мяне ёсць, але не хапае фізічных кандыцый. Не так адчуваю сябе па трасе, як раней. Я ж яшчэ кармлю дзіця (прыязджаю дамоў паміж трэніроўкамі) і таму ўсё зараз у мяне па-іншаму. У псіхалагічным плане, здаецца, я стала больш моцнай. З'яўленне дзіцяці навучыла мяне цярпенню, як мірыцца з абставінамі, наогул змяніла маё стаўленне да спорту і да ўсяго астатняга.

— Аднак гэта ўжо не першае ваша дзіця, таму кругагляд павінен быў змяніцца яшчэ, калі нарадзіўся сын...

— Так. Другое. Аднак першае дзіця нарадзілася даўно і па маладосці ўспрымалася па-іншаму. Цікава, што ў той час я таксама знаходзілася на скрыжаванні шляхоў: трэба было выбраць — ці працягваць спартыўную кар'еру альбо займацца чымсьці іншым. Так склалася, што я вырашыла яшчэ заставацца біятланісткай. Сям'я для мяне і зараз значыць шмат. Менавіта таму рашэнне зноў вярнуцца ў спорт мне далося не так лёгка, бо даводзіцца ўжо шмат чым ахвяраваць, адлучацца ад дваіх дзяцей. Я разумею, на што іду і чаго ад мяне чакаюць, раз я вярнулася. Аднак я нават не думала б зноў трэніравацца, калі б не падтрымка родных.

— Вам пашанцавала, што родныя разумеюць вашы пачуцці і падтрымліваюць...

— А як можа быць інакш! Маці ў мяне трэнер па лыжных гонках. Яна ведае, што значыць быць спартсменкай, таму разам з бацькам, які таксама мяне вельмі падтрымлівае, спрабуе зрабіць усё, толькі каб у мяне складвалася кар'ера. Яны спецыяльна прадалі кватэру ў Омску, пераехалі ў Мінск. Толькі дзякуючы бацькам я зараз магу займацца сваёй любімай справай.

— Ці дапамагае ў выхаванні Кірыла і Дашы муж?

— Так, але на ім таксама ляжыць вялікая нагрузка (муж Вольгі — трэнер па стральбе ў камандзе па біятлоне). У мяне нават больш вольнага часу, чым у мужа.

— Якая ўзроставая розніца ў вашых дзяцей?

— Сыну сем з паловай гадоў, а дачцэ — 9 месяцаў. Ведаеце, мне і мужу вельмі хацелася мець другое дзіця, а зацягваць да Ванкувера, дзе пройдзе чарговая Алімпіяда, мы не думалі, таму і вырашылі, што час надышоў.

— Ці пакінеце малое дзіця на бацькоў, калі пачнецца замежны збор у Аўстрыі?

— Вядома ж, не. Вазьму дачку з сабой, бо яе буду карміць яшчэ месяц. Сына пакіну тут, бо мы вырашылі не адрываць яго ад вучобы.

— Дачку ў вашай сям'і будзеце выхоўваць так як і сына, ці па іншай методыцы?

— Калі нараджаецца першае дзіця (незалежна ад полу), першы раз становішся маці, зразумела, адчуваеш вялікую адказнасць, таму часам бываеш занадта строгай у выхаванні. Да другога дзіцяці, мне падаецца, ужо ставішся больш спакойна, бо існуе вопыт выхавання. На першы план выходзяць радасць і любоў.

— Магчыма, вы чымсьці захапіліся за той год, што прапусцілі і сядзелі з дачкой?

— Я і рада была б, але не было часу, ды і сын пайшоў у школу, мне трэба было здаваць сесію ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Я ж будучы менеджар па турызме.

— Плануеце ў будучым працаваць у сферы турызму?

— Нават не ведаю. Я ж па першай адукацыі — юрыст-праваед. Пакуль ёсць магчымасць, я вучуся, а там, калі закончу са спортам, паглядзім, што выбраць. Пакуль я не думаю аб гэтым.

— Дзякуй за гутарку! Поспехаў вам у выхаванні дзяцей і ў спорце!

Ірына ПРЫМАК.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 29 (564)
аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

■ Катэдж, 40 км ад г. Ліды каля р. Нёман, 16 тыс. у.а. Тэл. маб. 889-95-10.

■ Дом з г/п, 10 км ад г. Любань. Тэл. (8-01713) 63-660, маб. 353-77-92.

■ Дом каля г. Мядзел, вялікі ўчастак зямлі. Тэл. (8-01797) 38-170.

■ Кватэра 1-пакаёвая ў г. Мінску (72 тыс. у.а.) ці абмяняю на пакой з даплатай. Тэл. (8-017) 337-16-57.

■ Гараж цагляны па вул. Машынабудаўнікоў (г. Мінск, Чыжоўка). Тэл. у Мінску 285-57-29.

■ Дом у Чэрвені. Тэл. (8-01750) 30-678.

■ Кватэра 3-пакаёвая кааператыўная, балкон, тэлефон, гараж у райцэнтры г. Гарадок, недорага. Тэл. (8-0212) 48-08-09, 8-029-216-17-09.

■ «VW-Гольф» 1992 г.в. 1,6 ТД, цёмна-сіні, люк, ц/з, добры стан, 2750 у.а., торг. Тэл. 8-029-771-51-78.

■ «Шкода форман» 1993 г.в., 1,3 бензін, фаркоп, добры стан, 1500 у.а., торг. Тэл. (8-01770) 51-608, маб. 330-41-06.

■ «Фіят-ціпо» 1991 г.в., 1,4 бензін, у Клецкім раёне. Тэл. 168-41-64.

■ «Аўдзі-100» 1983 г.в., 1,9 бензін. Тэл. 948-46-80.

■ Супер-млын, 4 кВт, дзве тоны ў гадзіну, нядорага. Тэл. (8-017) 253-55-40, 8-029-709-12-87.

■ Трактар МТЗ-50 з навясной бульбакапалкай. Тэл. 8-029-838-79-41, (8-02345) 92-257.

■ Мыйка з нержавейкі, б/к, памер 80х60, радыятар да «Аўдзі-80» 1991 г.в., б/к. Тэл. 8-029-873-47-07, (8-01725) 49-964.

■ Трактар Т-40, пярэдні вядучы мост, выдатны стан, шмат з/ч. Тэл. (8-01634) 98-371.

КУПЛЮ

■ Трактар МТЗ-80, -82, пажадана з прычэпам. Тэл. 8-029-709-22-56.

■ Трактар МТЗ-80 ці МТЗ-82 у рабочым стане, магчыма без дакументаў. Тэл. 565-05-32.

■ Дом. Тэл. 8-029-778-33-38.

■ Памяшканне пад вытворчасць, склад, офіс, магазін. Тэл. 8-029-682-14-42.

■ Дом па Слуцкім ці Брэсцкім напрамку, да 50 км ад Мінска, дорага, без пасрэднікаў. Тэл. (8-017) 295-65-98, увечары.

■ Жыллё ў г. Мінску ці раёне, без пасрэднікаў. Тэл. 764-42-91.

■ Счэпнае прыстасаванне да «Сітраен ксара» 1999 г.в., ТД, універсал. Тэл. (8-01594) 22-494, 363-40-95.

■ Трактар МТЗ. Тэл. 8-029-655-07-16.

■ Дачу ці дом у Мінскім раёне. Тэл. (8-017) 227-28-12.

■ Гараж у г. Мінску. Тэл. 8-029-771-52-90.

■ «VW-пасат» В-2, універсал, у добрым стане. Тэл. 8-029-121-41-25.

■ Матаблок. Тэл. 8-029-183-44-70.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.
Тэлефон для даведак 287-17-79.
Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____
Подпіс_____ Дата_____

ПРУЖАНСКІ «СУПЕРМУХАЛОЎ»

Пружанскі прадпрымальнік Генадзь КОЗЕЛ распрацаваў цікавы прыбор — біятэхнічную пастку для насякомых. Цяпер яго «мухалоў» карыстаецца папулярнасцю не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.

Сёлета пружанскі вынаходнік стаў сярэбраным прызёрам сёмага Маскоўскага міжнароднага салона па інавацыях і інвестыцыях як аўтар адной з лепшых інавацыйных распрацовак. Нядаўна Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі на падставе заключэння міжнародных экспертных арганізацый уключыў «супермухалоў» у спіс лепшых вырабаў айчынных прадпрыемстваў, якія выпускаюць высокатэхналагічную прадукцыю. Зараз у адпаведнасці з рэспубліканскай экспартнай праграмай прыбор можа пастаўляцца практычна ва ўсе краіны свету.

Яна СВЕТАВА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.495 Індэкс 63850. Зак. № 5493. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12